Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ВЕРАСНЯ 2017 г. АЎТОРАК №185 (28549)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Грыбы: смачна ці бяспечна

СТАР. 7



На шляху да Еўрапейскіх гульняў

СТАР. 9




Лынтупы. Убачыць і дапамагчы

СТАР. 13

# Каму яблычак?

## Па ўсёй краіне — сезон сельскагаспадарчых кірмашоў

СТАР. 4



**Мікалай СІМАНОВІЧ з Давыд-Гарадка прывёз свойскія перцы, баклажаны, яблыкі, грушы.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br844,4**

*склала сярэдняя налічаная заработная плата работнікаў Беларусі ў жніўні 2017 года (у ліпені было Br827,5) паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у жніўні дасягнула таксама Br844,4 (у ліпені яна была роўная Br827,5).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9394 | ▲ |
| Еўра | 2,3094 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0736 | ▼ |

■ Незвычайнае побач

## ЗЯЛЁНАЕ КОЛА, «ДАРОЖНЫЯ ГІСТОРЫІ» І САКРЭТЫ ВАКОЛІЦ,

### або Чым здзівіць турыстаў

**Сёння турыстам, якія прыязджаюць у сталіцу, прапануюць самыя разнастайныя экскурсіі. У прыватнасці, ім гатовы паказаць Мінск таямнічы, нефармальны, нетыповы, начны і нават арганізаваць падарожжа з заплюшчанымі вачыма. Але зусім неабавязкова «ўключаць» крэатыў, каб зацікавіць турыстаў. Пра што можна было б расказаць, што паказаць і што трэба было б зрабіць для таго, каб уразіць гасцей сталіцы?**

### Дамы-старажылы

*Яшчэ і сёння на «жывых экспанатах» можна вывучаць гісторыю старога Мінска: дзе-нідзе ў горадзе захаваліся драўляныя дамы, у тым ліку і стагадовыя. Нават калі проста «капаць», хто і калі тут жыў, набярэцца інфармацыі не на адну экскурсію. А можна падабраць і цікавыя экспанаты — яшчэ і сёння нашчадкі могуць захоўваць старыя фота і рэчы, якія належалі папярэднім гаспадарам. Часам «драўляныя астраўкі» абрастаюць рознымі легендамі, але багата і фактаў, звязаных са знакамітымі жыхарамі такіх мясцін. Напрыклад, узгадаем Верхнюю і Ніжнюю Ляхаўку, Уборкі. Шэраг унікальных дамоў з багатымі інтэр'ерамі яшчэ захаваўся ў Паўночным завулку (на жаль, сёння ён у сумным стане — метро дажымае).*

— Раней ва Уборках пераважна жылі чыгуначнікі, само сабой зразумела, — побач быў вагонарамонтны завод, станцыя. У той час многія больш-менш заможныя жыхары горада будавалі флігелі. У дамах жылі самі, а флігель здавалі ў наём, — расказвае **дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэмік Аляксандр ЛАКОТКА**. — І вось у гэтых Уборках па Малагеоргіеўскай вуліцы стаяў дом школьнага настаўніка Савы Іванавіча і Алены Іванаўны Рэдзькаў, а ў флігелі жыў Змітрок Бядуля. Пасля да яго на гэту ж кватэру пасяліўся Максім Багдановіч (між іншым, там пісьменнік напісаў многія знакавыя рэчы). Туды прыходзіла і Зоська Верас (я бачыў яе лісты). Я займаўся рэстаўрацыяй гэтага дома — сёння там філіял музея Максіма Багдановіча. Праўда, будынак перамясцілі з Малагеоргіеўскай (яна была перайменавана ў вуліцу Талстога) на Рабкораўскую. Урочышча Уборкі старое, там могуць быць стагадовыя дамы і, можа, нават больш старажытныя.

СТАР. 5

■ Сацыяльны вектар

## І ЗНОЎ ПРА ПЕНСІІ

### Адмена пенсійнага пасведчання зараз не плануецца

**Заканадаўства ў галіне пенсійнага забеспячэння пастаянна ўдасканальваецца. Так, цяпер прапрацоўваецца пытанне аб выплаце індывідуальнымі прадпрымальнікамі — плацельшчыкамі адзінага падатку страхавых узносаў прапарцыйна адпрацаванаму часу. Таксама эксперты Беларусі і Расіі зараз сумесна працуюць над прапановамі па карэкціроўцы нормаў Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння — у сувязі са зменамі, унесенымі ў пенсійнае заканадаўства Беларусі і Расіі. Але ў людзей, як правіла, узнікае шмат пытанняў і па тых нормах, якія ўжо прынятыя і працуюць. Днямі на такія пытанні ўсіх ахвотных адказалі спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падчас анлайн-канферэнцыі, прысвечанай пенсійнаму забеспячэнню. Прыводзім найбольш актуальныя і цікавыя з іх.**

СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ГАРАНТЫЯ АДКАЗНАСЦІ І ЎЗАЕМНАСЦІ

## Прэзідэнт сустрэўся з Рамзанам Кадыравым

**Знешняя палітыка нашай дзяржавы ў многім завязана на выбудоўванні супрацоўніцтва паміж нашымі і замежнымі рэгіёнамі. Таму ні для кога не дзіва, што ў Палацы Незалежнасці рэгулярна адбываюцца сустрэчы не толькі з прадстаўнікамі ўрада, першымі асобамі замежных краін, але і з дэлегацыямі з рэгіёнаў. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Чачэнскай Рэспублікі.**

Рамзан Кадыраў наведвае нашу дзяржаву ўпершыню.

— Беларусь заўсёды была добрым домам для ўсіх народаў былога Савецкага Саюза, ды і цяпер да нас прыязджае мора людзей з усёй планеты, ніхто ніколі не крыўдзіўся на гасціннасць нашага народа, — адзначыў беларускі лідар, вітаючы госця. — Гэта візітная картка беларусаў. Гэта не толькі заслуга цяперашняй улады, так было заўсёды.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: ён вельмі рады сустрэчы з кіраўніком Чачні.

— Я думаю, вам спадабаецца ў Мінску, у Беларусі, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, — і вы не толькі афіцыйна, але і ў любы час знойдзеце магчымасць пабываць у нас, пазнаёміцца бліжэй з беларусамі. У нас нямала чачэнцаў жыве, мы з імі ніколі не мелі праблем — абсалютна ніколі. Таму вы зможаце ўбачыць сваіх суайчыннікаў, з імі пазнаёміцца.

Асобная тэма — рэгіянальнае супрацоўніцтва. Канцэпцыя, агучаная Прэзідэнтам, простая: калі б не было супрацоўніцтва Беларусі з рэгіёнамі, увогуле не было б беларуска-расійскіх адносін.

— Мы перажылі няпростыя часы, калі ў нас было непаразуменне па асобных пытаннях з цэнтрам, — сказаў кіраўнік краіны. — Але рэгіяналы выратавалі нашы адносіны. Мы заўсёды падтрымлівалі з губернатарамі, кіраўнікамі рэспублік, краёў, абласцей вельмі цесныя, добрыя адносіны. Мы па-брацку будуем свае адносіны з прадстаўнікамі шматнацыянальнай Расіі. Сёння заўважная вельмі сур'ёзная тэндэнцыя да паглыблення нашых адносін, нягледзячы на санкцыі, ціск з боку Захаду, які зараз здзяйсняецца на Расію...

Прэзідэнт нашай дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі добра ведаюць пра развіццё Чачэнскай Рэспублікі і вельмі рады за яе.

— Вы проста малайцы, паднялі з руін, з попелу свой кавалак зямлі, усялілі ўпэўненасць у народ Чачэнскай Рэспублікі, — зазначыў Прэзідэнт. Для Беларусі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта вельмі перспектыўны, аўтарытэтны рэгіён:

— Мы хацелі б не толькі супрацоўнічаць з Грозным, з Чачэнскай Рэспублікай, але і разам з вамі працаваць на Каўказе — што датычыцца эканомікі, эканамічных адносін. Мы спакойна можам будаваць там сумесныя прадпрыемствы. Супрацоўнічаючы ў гэтым плане, ствараць сумесны высокатэхналагічны прадукт. Гандляваць у вашым рэгіёне: не толькі на поўдні, але і на поўначы.

Кіраўнік нашай дзяржавы прывёў у прыклад супрацоўніцтва з Сахалінам.

— Мы даўно сябруем з кіраўніком Сахаліна, калі ён яшчэ ў Амурскай вобласці працаваў, — прыгадаў Аляксандр Лукашэнка. — Добры рускі чалавек, неяк прыехаў, папрасіў падтрымкі. А пасля яго «перакінулі» на Сахалін. Прыехаў, кажа: грошы ёсць, але ўсё набываем, завозім, нічога свайго няма. Кажу: давай зробім, каб Сахалін мог пракарміць свой народ і суседзяў. Сёння мы ствараем там прадпрыемствы. У наступным годзе адкрыем узорнае прадпрыемства на Сахаліне. Таму па нейкіх кірунках мы аналагічна можам працаваць з Чачэнскай Рэспублікай.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гаворка ідзе пра высокатэхналагічны прадукт, які сёння запатрабаваны як у каўказскім рэгіёне, так і ў Расіі ўвогуле:

— Ключавая тэма — кааперацыя. Гэта найбольш прасунутая, узаемавыгадная форма супрацоўніцтва, у рамках якой можна задаволіць патрэбы рэгіянальнага рынку, а таксама стварыць высокатэхналагічныя працоўныя месцы.

У Чачні ствараецца вытворчасць аўтамабіляў. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў нас, у Беларусі, ёсць прадпрыемства, якое мае вопыт супрацоўніцтва з Расіяй, — «Аўтакампаненты»:

— Мы можам супрацоўнічаць з вамі. Прытым, безумоўна, гэтыя аўтакампаненты вы можаце набыць у любой краіне, дамовіцца з любым бізнесменам, але мы вам гарантуем не толькі якасць і цану. Мы вам гарантуем найсур'ёзнейшую абавязковасць. У нас дзяржава адказвае за падобныя рэчы.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, для нас вельмі важнае пытанне адказнага партнёра:

— З вамі ў нас няма праблем, таму што ў вас дзяржава мае моцную ўладу, вы маеце моцны ўплыў на ўсе сектары. Гэтак жа і ў нас. Вы нават можаце не баяцца, калі будзеце супрацоўнічаць з нашымі кампаніямі і прадпрыемствамі, што яны недзе вас падмануць. Гэтага быць не можа. Гэта таксама вельмі важна ў наш няпросты час, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што магчымасці Беларусі ў галіне машынабудаўніцтва вядомыя. Рэспубліка была вядучай у гэтай сферы ў Савецкім Саюзе. Наша краіна, акрамя гэтага, можа прапанаваць свае паслугі ў сферы хіміі і нафтахіміі, у сельскай гаспадарцы, пастаўках пасажырскай, камунальнай тэхнікі, — спектр для супрацоўніцтва шырокі. Акрамя гэтага, Прэзідэнт прапанаваў стварыць сумесную вытворчасць такой тэхнікі ў Чачні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Рамзан КАДЫРАЎ, кіраўнік Чачэнскай Рэспублікі:**

— Мы дамовіліся ў першую чаргу аб супрацоўніцтве ў эканоміцы, прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Прэзідэнт даў дакладныя даручэнні міністэрствам, ведамствам, каб яны перайшлі да справы больш канкрэтна. Зараз, я думаю, будуць зроблены канкрэтныя крокі. Мне вельмі спадабалася сустрэча, я вельмі даўно хацеў убачыцца з беларускім лідарам.

# РАБОТА ПЛАНАВАЯ І ЭФЕКТЫЎНАЯ

**Адміністрацыя Прэзідэнта праводзіць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. Гэта дазваляе не толькі даведацца і вырашыць пытанні, якія турбуюць грамадзян, але і непасрэдна ажыццявіць маніторынг сітуацыі на месцах.**

**28 верасня начальнік аддзела аналізу і кантролю галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб КАЛІНІН Ігар Іванавіч** правядзе прыём у адміністрацыі *Партызанскага раёна Мінска з 10.00 да 13.00.*

**29 верасня першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення кіруючых кадраў і дзяржаўных узнагарод Адміністрацыі Прэзідэнта РЭШАЦЬКО Генадзь Уладзіміравіч** прыме грамадзян у *Віцебскім райвыканкаме таксама з 10.00 да 13.00.*

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У Германіі можа быць створаны трохпартыйны ўрад




Нядзельныя выбары ў бундэстаг шмат у чым сталі паваротнымі. Упершыню дзве галоўныя палітычныя сілы ХДС/ХСС і СДПГ паказалі такія слабыя вынікі, упершыню ў парламент прайшла партыя больш правых поглядаў, чым ХДС, і ўпершыню ў краіне можа быць створаны трохпартыйны ўрад. Паводле канчатковых даных нямецкага Цэнтрвыбаркама, партыйны альянс ХДС/ХСС на чале з Меркель лідзіруе з 33 працэнтамі (246 месцаў у бундэстагу) — гэта найгоршы яго вынік з 1949 года. Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ) на чале з Марцінам Шульцам атрымлівае 20,5 працэнта (153 месцы), таксама дабіўшыся найгоршага выніку ў гісторыі. Правая «Альтэрнатыва для Германіі» ўпершыню праходзіць у нямецкі парламент з 12,6 працэнта і адразу становіцца трэцяй сілай у бундэстагу (94 месцы). Ліберальная Свабодная дэмакратычная партыя (СвДП) атрымлівае 10,7 працэнта (80 месцаў), «Левыя» — 9,2 працэнта (69 месцаў) і «Зялёныя» — 8,9 працэнта (67 месцаў).

## Кошт нафты Brent падняўся вышэй за $57

Кошт лістападаўскага ф'ючарса на нафту маркі Brent упершыню з пачатку сакавіка перавысіў 57 долараў за барэль. Пра гэта сведчаць даныя таргоў на біржы ICE. Адзнаку ў 56 долараў Brent перавысіла 20 верасня. «Глабальная празмернасць на сусветным рынку нафты скарачаецца дзякуючы абмежаванню здабычы сыравіны АПЕК і краінамі, якія не ўваходзяць у арганізацыю, заўважылі галіновыя міністры падчас нядаўняй нарады ў Вене», — адзначае Reuters. Кіраўнік Мінэнерга Расіі Аляксандр Новак мяркуе, што нафтавытворцы будуць вырашаць пытанне аб неабходнасці працягваць пагадненне не раней за студзень 2018 года.

## На Балі з-за ўзрослай актыўнасці вулкана эвакуіравалі каля 50 тысяч чалавек



Па даных Нацыянальнага ўпраўлення па ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў Інданезіі, у цэнтры эвакуацыі было дастаўлена 14 тон гуманітарнай дапамогі. Вулканолагі пашырылі зону небяспекі, мясцовыя ўлады ўвялі рэжым надзвычайнага становішча на востраве да 1 кастрычніка. Агунг уваходзіць у лік 130 актыўных вулканаў Інданезіі, якія з'яўляюцца часткай так званага вогненнага кольца — вулканічнай зоны, што апяразвае Ціхі акіян. Апошні раз Агунг вывяргаўся ў 1963—1964 гадах, калі загінула больш за тысячу чалавек.

## Названыя самыя крымінальныя рэгіёны Расіі

Генеральная пракуратура Расіі апублікавала рэйтынг самых крымінальных раёнаў краіны. Адзначаецца, што лідарам па колькасці зарэгістраваных злачынстваў са студзеня па чэрвень 2017 года з'яўляецца Масква — 71 961. Следам ідзе Маскоўская вобласць з 43 668 інцыдэнтамі. Трэцяе месца заняў Краснадарскі край, дзе зафіксавана 33 492 злачынствы. Менш за ўсё крыміналу ў Чукоцкай аўтаномнай акрузе — 377 злачынстваў. У дакладзе адзначаецца, што ва ўсіх рэгіёнах зафіксавана зніжэнне ўзроўню злачыннасці. У прыватнасці, у Маскве колькасць злачынстваў зменшылася на 23,9 працэнта.

### Геапалітыка

# У рэчышчы станоўчай дынамікі



## Як перавесці беларуска-брытанскія адносіны на новы ўзровень

**Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі з'яўляецца вельмі важнай у дынаміцы міжнародных адносін дзяржавай.**

Перш за ўсё, трэба памятаць пра некалькі вельмі важных фактаў, якія падкрэсліваюць значнасць гэтай краіны. Нельга забываць, што Вялікабрытанія аж да 1960-х гадоў мінулага стагоддзя была адной з найбуйнейшых імперый на планеце. Цяпер гэта ўжо не так, але спадчына не магла не застацца. Для Вялікабрытаніі гэта актывы па ўсім свеце ў былых калоніях, якія робяць эканоміку краіны інтэрнацыянальнай. Вялізная тэрыторыя і гандлёвыя інтарэсы выклікалі да жыцця з'яўленне першай у свеце транснацыянальнай карпарацыі — Брытанскай Ост-Індскай кампаніі ў 1600 годзе. Наколькі гэтая ініцыятыва аказалася значнай, можна меркаваць па тым, што цяпер у свеце ўжо больш як сто тысяч транснацыянальных карпарацый, і многія з іх маюць брытанскую юрысдыкцыю.

Для ролі Лондана на сусветнай арэне таксама важна створаная з былымі калоніямі Брытанская садружнасць нацый. У яе ўваходзіць больш за пяцьдзясят краін з насельніцтвам, якое хутка наблізіцца да двух мільярдаў чалавек. Нарэшце, стагоддзі валодання велізарнай імперыяй дазволілі сфарміраваць гіганцкую фінансавую сістэму. У дадзены момант яна з'яўляецца другой у свеце па актывах пасля ЗША. Не варта забываць і пра лонданскую біржу, якая стала месцам выхаду ў свет многіх найбуйнейшых кампаній сучаснасці.

Беларуска-брытанскія адносіны не назавеш узорнымі, але не з-за адсутнасці ініцыятыў з беларускага боку. Проста так складвалася сітуацыя ў першыя дзесяцігоддзі нашых стасункаў.

Найважнейшая асаблівасць знешняй палітыкі Вялікабрытаніі — апора на супрацоўніцтва з ЗША. Гэта не менш цеснае супрацоўніцтва, чым у Беларусі з Расіяй. Блізкасці адносін спрыяе агульная англійская мова і той факт, што ў ЗША, як у былой брытанскай калоніі, многія ўплывовыя грамадзяне маюць сваяцкія сувязі з Вялікабрытаніяй. Акрамя гэтага, вялізныя актывы, якія належаць Вялікабрытаніі па ўсім свеце, больш не суправаджаюцца ўласнай вялізнай арміяй. Тэрыторыя Вялікабрытаніі на гэты момант толькі на трыццаць працэнтаў большая за беларускую, а насельніцтва перавышае беларускае ў шэсць з паловай разоў. У гэтай сітуацыі гарантам бяспекі брытанскіх актываў выступае адна з найбуйнейшых у свеце армій — армія ЗША. У выніку дрэнныя адносіны з Вашынгтонам, якія не па сваёй волі склаліся ў Мінска ў другой палове 1990-х, трансфармаваліся і ў дрэнныя адносіны з Лонданам. Не спрыяла паляпшэнню адносін і падобная дынаміка адносін з Еўрасаюзам, часткай якога з'яўляецца Вялікабрытанія.

У апошнія гады сітуацыя мяняецца да лепшага. Цікавасць да Беларусі з'явілася ў Вялікабрытаніі разам са стартам Усходняга партнёрства ў 2009 годзе, у якім краіна прымала значны ўдзел. У апошнія гады назіраецца і сур'ёзная разрадка ў стасунках Беларусі з ЗША і ЕС. Ды і сама Вялікабрытанія ўжо не тая. Пасля прынятага ў 2016 годзе рашэння аб выхадзе з ЕС назіраюцца адчувальныя супярэчнасці Лондана і Брусэля, якія знаходзяцца ў шлюбаразводным працэсе, што падахвочвае Вялікабрытанію актывізаваць сваю дзейнасць на новых напрамках.

Злучанае Каралеўства з'яўляецца адным з найважнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі. За першыя сем месяцаў 2017 года дынаміка тавараабароту з Вялікабрытаніяй не тое што проста станоўчая, а выдатная. Беларускі экспарт вырас у два з лішнім разы ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года — да 1 мільярда 378 мільёнаў долараў. Пры ўмове захавання такой жа дынамікі да канца года ёсць шанц наблізіцца да пачаткаў 2015 года, якія склалі 2 мільярды 941 мільён. Сальда знешняга гандлю ў 2017 годзе дадатнае — 1 мільярд 250 мільёнаў. Недахопам з'яўляецца апора ў беларускім экспарце на нафтапрадукты, што робіць яго залежным ад кан'юнктуры рынку.

У наступныя гады нам неабходна зрабіць многае. У якасці яўнага прыярытэту выступае інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Найбуйнейшы ў Еўропе фінансавыя актывы пад кантролем Лондана могуць паслужыць развіццю беларускай эканомікі. У дадзены момант у Беларусі ажыццяўляюць дзейнасць больш як 400 кампаній з брытанскім капіталам. Здавалася б, нядрэнны паказчык, але такі ж у Беларусі маюць Латвія і Літва, магчымасці якіх не супастаўныя з брытанскімі.

Не варта забываць і пра супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Брытанская адукацыйная сістэма з'яўляецца вельмі магутнай, і сотні беларусаў ужо атрымалі адукацыю ў яе рамках. Больш цеснае супрацоўніцтва беларускіх і брытанскіх універсітэтаў можа адыграць важную ролю для далейшага ўмацавання адукацыйнай сістэмы Беларусі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Блізкая ўлада

# РЭАГАВАЦЬ НА ЗВАРОТ, ЯК НА ПРОСЬБУ МАЦІ

**Вырашыць спрэчку паміж сваякамі па частцы спадчыннай хаты, усталяваць плот паміж суседзямі ці падзяліць склеп, які знаходзіцца на мяжы двух участкаў. Гэтыя і іншыя праблемы агучвалі жыхары Гомельшчыны старшыні аблвыканкама Уладзіміру ДВОРНІКУ на апошняй прамой тэлефоннай лініі. Кіраўнік рэгіёна ў мінулую суботу паспеў пагаварыць з 24 грамадзянамі.**


Фота БЕЛТА.

Людзей, якія датэлефанаваліся, хвалявалі пытанні, што датычацца не толькі зямельных і маёмасных адносін, але і пенсійных выплат, вырашэння камунальных і бытавых праблем, выдзялення матэрыяльнай дапамогі. Некалькі грамадзян звярнуліся па кансультацыі.

Жыхар Калінкавічаў, які вымушаны па стане здароўя прытрымлівацца строгай дыеты, папрасіў дапамагчы набыць яму айчынную грэчку, якая куды больш якасная, чым замежная. Гамяльчанка расказала пра сітуацыю, звязаную з правядзеннем капітальнага рамонту ў кватэры, якую затапіла якраз падчас работ. На гэты момант рамонт цалкам не зроблены і не кампенсавана нанесеная шкода. Яшчэ адзін гамяльчанін даўно спрабуе прасунуць ідэю стварэння на Гомельшчыне фермы для ўтрымання ласёў. Мужчына намагаўся пераканаць кіраўніка абласной вертыкалі ўлады, што гэта эканамічна мэтазгодна: у Расіі з ласінага малака атрымліваюць дарагі прадукт, які выкарыстоўваюць у лячэбных мэтах.

Па кожным звароце Уладзімір Дворнік даў даручэнні адпаведным службам. Падводзячы вынікі трохгадзінных зносін, губернатар адзначыў, што падчас прамой лініі не паступала пытанняў, якія можна аднесці да ліку невырашальных, а да работы са зваротамі грамадзян неабходна больш актыўна запрашаць дэпутатаў розных узроўняў. Асабліва гэта датычыцца зямельных спрэчак, канфліктаў з-за спадчыны, складаных бытавых праблем:

— Чалавек можа памыляцца ў сваіх дамаганнях, ігнараваць пры гэтым заканадаўства. Такім людзям патрэбны не толькі афіцыйны дакумент з пячаткай, але і псіхалагічная дапамога, гутарка. Рэагаваць на просьбы пажылых грамадзян неабходна хутка і якасна. І выконваць работу так, нібы для сваёй маці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ЁСЦЬ ПОПЫТ — ПАВІННА БЫЦЬ І ПРАПАНОВА

**Жыллёва-камунальным службам Брэсцкай вобласці неабходна больш актыўна прыцягваць прыватнікаў да аказання лазневых паслуг насельніцтву. Такое даручэнне даў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС падчас правядзення прамой тэлефоннай лініі ў суботу, паведамляе БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Жыхар Брэсцкага раёна, які дазваніўся губернатару, пацікавіўся, ці магчыма адкрыццё лазні на стыку вёсак Тамашоўка і Камароўка (каля 72 км ад Брэста). Анатоль Ліс запэўніў, што пытанне будзе вывучана і ў залежнасці ад попыту на гэтую паслугу будзе прынята адпаведнае рашэнне. Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу службаў ЖКГ на залучэнне да аказання дадзеных паслуг прыватных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, тым больш што такі вопыт у Брэсцкай вобласці ўжо ёсць.

У цэлым, размаўляючы з жыхарамі рэгіёна, губернатар асаблівую ўвагу ўдзяліў сферы паслуг у розных галінах. «Усе паслугі, якія аказваюцца людзям арганізацыямі, установамі, прадстаўнікамі бізнесу, павінны адпавядаць устаноўленым патрабаванням. Іх неабходна выконваць якасна і своечасова, па абгрунтаваных цэнах», — падкрэсліў Анатоль Ліс.

За тры гадзіны кіраўнік вобласці адказаў на 30 тэлефонных званкоў. Трэць пытанняў датычылася жыллёва-камунальнай сферы. Так, падымаліся праблемы ўцяплення кватэры, нездавальняючага стану дахаў дамоў і балконаў. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама даручыў адпаведным службам устанавіць прычыны несвоечасовага і няякаснага выканання работ, а таксама выправіць сітуацыю, якая склалася. Акрамя таго, грамадзян цікавілі пытанні працаўладкавання, газіфікацыі прыватных дамоў, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, будаўніцтва і рамонту дарог.

Па ўсіх зваротах губернатар даў канкрэтныя даручэнні ■

# БЕЛАЗ РУЛІЦЬ

## Краіна адзначыла Дзень машынабудаўніка

**Так гістарычна склалася, што Дзень машынабудаўніка штогод адзначаюць у чацвёртую нядзелю верасня. Традыцыя бярэ пачатак яшчэ з 1980 года, калі гэты дзень афіцыйна стаў святочным. У нашай краіне яго адзначылі каля 300 тысяч работнікаў. Але гэта дома, у коле сям'і і сяброў. У краіне, дзе машынабудаванне з'яўляецца народным здабыткам, да свята рыхтуюцца загадзя. На працягу ўсяго мінулага тыдня праходзілі канферэнцыі, святкаванні, форумы, падпісваліся кантракты і нават устанаўліваліся сусветныя рэкорды.**

Якое свята машынабудаўніка абыдзецца без «БелАЗа»? У Жодзіне на базе машынабудаўнічага гіганта ў мінулую суботу зрабілі дзень адчыненых дзвярэй. Гэтая традыцыя існуе ўжо больш за 10 гадоў. Сёлета мерапрыемства сабрала некалькі тысяч чалавек. Свабодна можна было зайсці ў некаторыя цэхі, у тым ліку і ў цэх галоўнага канвеера, цэх зборкі, выпрабаванняў аўтамабіляў і цягачоў, музей працоўнай славы. Святочную атмасферу падтрымалі канцэртная праграма і выступленне прадстаўнікоў варкаўт-руху.

Завод ужо сёння можа пахваліцца станоўчымі вынікамі працы. Па словах генеральнага дырэктара кампаніі «БелАЗ» Пятра Пархомчыка, прадпрыемства за 8 месяцаў дасягнула леташніх паказчыкаў, а некаторыя з іх змагло перавысіць. Экспарт тэхнікі за гэты час у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас практычна ў два разы. Аб'ём адгрузкі і экспарту па выніках 8 месяцаў перавысіў узровень усяго 2016 года на 60 млн долараў. У 2017-м прадукцыя «БелАЗа» экспартавалася ў 25 краін, найбольшыя па аб'ёме пастаўкі тэхнікі з пачатку года ажыццёўлены ў Расію — 381 адзінка, Зімбабвэ — 52 і Узбекістан — 47. Святкаванне Дня машынабудаўніка ў Жодзіне не абмяжавалася заводскімі сцэнамі. На пляцоўцы каля Палаца культуры «БелАЗа» адбылася канцэртная праграма «Горад віншуе машынабудаўнікоў» з усімі складнікамі святочнай феерыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

# Вялікі Скарына — у мініяцюры

## Адмысловае выданне прыехала ў Мінск з Баку

**Кнігу Юдзіф у мініяцюры выдала Зарыфа Салахава, вядомы грамадскі дзеяч і заслужаны дзеяч культуры Азербайджана, стваральнік і заснавальнік Музея мініяцюрнай кнігі ў горадзе Баку. Выданне прадставілі ў мінскай кнігарні «Светач».**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Фармат кнігі 50 на 55 мм. Яна складаецца з 214 старонак, куды ўваходзіць факсімільнае выданне, тое, што было выдадзена Францыскам Скарынам 9 лютага 1519 года на 26 аркушах. Перад кожным раздзелам у кнізе — партрэт Скарыны. Кніга выдадзена на беларускай, рускай і англійскай мовах тыражом 100 экзэмпляраў.

— Усё ў гэтым свеце прыходзіць і адыходзіць, застаюцца толькі кнігі. Я шчаслівая, што гэтая кніга, нароўні з іншымі беларускімі кнігамі, стаіць у маім музеі. 2913 унікальных кніг музея трапілі ў Кнігу рэкордаў Гінеса, — расказала Зарыфа Цеймураўна. — У 2012 годзе я была ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны. І я ўсцешана, што зараз магу апраўдаць сваю ўзнагароду.

Гэты праект серыі «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» рэалізаваны пры ўдзеле Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Кангрэса азербайджанскіх абшчын Рэспублікі Беларусь.

У Беларусі рэгулярна выходзяць кнігі азербайджанскіх аўтараў, з'яўляюцца пераклады з азербайджанскай мовы. Азербайджанцы таксама праяўляюць цікавасць да беларускай літаратуры. Напрыклад, да Дня пісьменства сёлета вядомы азербайджанскі пісьменнік Камран Назірлі прывёз кнігі трох беларускіх аўтараў, выдадзеныя ў Баку. Важкі ўнёсак ва ўмацаванне сяброўства дзвюх дзяржаў робяць пасольства Азербайджанскай Рэспублікі ў Беларусі і Кангрэс азербайджанскіх абшчын Рэспублікі Беларусь. Старшыня Кангрэса Націк Багіраў адзначыў:

— Для нас, прадстаўнікоў азербайджанскай дыяспары, для каго Беларусь стала другой радзімай, вялікі гонар мець дачыненне да гэтага выдавецкага праекта. Зарыфа Салахава зрабіла цудоўны падарунак да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, — гэта прыгожая і дарагая ў гісторыі дата, якой можа ганарыцца кожны беларус.

Націк Багіраў таксама нагадаў, што раней Зарыфай Салахавай быў надрукаваны шэраг мініяцюрных кніг, сярод якіх інаўгурацыйная прамова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Купалава «Жалейка» ў двух тамах. Кніга Юдзіф — чарговы этап у беларуска-азербайджанскім культурным сяброўстве.

У канцы прэзентацыі Саюз пісьменнікаў Беларусі па даручэнні старшыні Мікалая Чаргінца ўзнагародзіў Зарыфу Салахаву памятным дыпломам за вялікі ўклад у развіццё беларуска-азербайджанскіх адносін і шматгадовую папулярызацыю твораў беларускіх аўтараў за мяжой.

**Ксенія ВЯДЗМЕДЗЬ.**

■ Надвор'е

# БЕЗ ДАЖДЖОЎ, АЛЕ ПАХАЛАДАЕ

## У другой палове тыдня — замаразкі ўначы

**У апошні тыдзень верасня захаваецца антыцыклональны характар надвор'я. Таму ападкаў не будзе, але тэмпературны фон пачне паступова паніжацца, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У сераду будзе без ападкаў, але чакаецца ўжо больш халоднае надвор'е. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да 2—9 цяпла, а днём складзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў. Сіноптыкі падлічылі, што і ў чацвер ападкаў па краіне не чакаецца. Праўда, паветра будзе паступаць больш халоднае і вільготнае, таму ўначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, у асобных раёнах краіны чакаюцца слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Будзе не горача і ўдзень — максімальная тэмпература не вышэйшая за 9—16 цяпла. І ў пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе толькі ад плюс 1 да плюс 7 градусаў, месцамі чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 3 градусаў. Удзень чакаецца 9—16 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# «Слуцкія паясы» ў трэці раз сабралі сяброў

**Каля 500 майстроў па больш як 20 кірунках народнай творчасці з розных куточкаў Мінскай вобласці і ўсёй Беларусі ўзялі ўдзел у абласным свяце традыцыйных мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы». Умельцы дэманстравалі свае работы з саломкі і лазы, дрэва, ткацкія, вышываныя, ганчарныя вырабы. Пачэснае месца ў «Рамеснай слабадзе» займаў беларускі пояс.**



Адкрыў свята старшыня Слуцкага райвыканкама Андрэй Янчэўскі. Ён, у прыватнасці, падкрэсліў, што народная творчасць — вытокі духоўнасці беларусаў, нацыянальнай культуры. Кіраўнік раёна акцэнтаваў увагу на тым, што народныя ўмельцы Міншчыны не толькі беражліва захоўваюць традыцыі таленавітых продкаў, але і годна іх працягваюць.

Вельмі прывабным і захапляльным атрымаўся конкурс «Беларуская лялька», большасць удзельнікаў якога — навучэнцы гуртка і студый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У межах мерапрыемства прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя.

Сапраўднымі брэндамі Мінскай вобласці сталі Капыльскія і Старадарожскія ручнікі, Лагойская і Івянецкая кераміка, Клецкая і Маладзечанская лаза, Вілейская і Мядзельская разьба па дрэве.

Цікава было назіраць за дэфіле хлопцаў і дзяўчат у народных строях «Погляд у мінулае», лазерным шоу. Гараджан і гасцей забаўлялі песнямі, танцамі творчыя калектывы Случчыны. З задавальненнем удзельнікі мерапрыемства паглядзелі канцэрт тэлевізійнага праекта «Новыя галасы Беларусі», а таксама танцавальную праграму «Збяром вакол сяброў».

На пляцоўках працавалі шматлікія выстаўкі, майстар-класы, а для дзяцей — атракцыёны. Быў разгорнуты і выязны гандаль.

У завяршэнне свята Слуцкаму цэнтру традыцыйнай культуры ўручаны пояс Мінскай вобласці. Гэта вынік калектыўнай работы. Яго саткалі на працягу дня ўмельцы Міншчыны.

Фэст «Слуцкія паясы» малады, але ўжо займеў прыхільнікаў не толькі ў цэнтральным рэгіёне, але і па ўсёй краіне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Каму яблычак?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Бульба і морква, капуста і цыбуля, перац і таматы, яблыкі, зеляніна, ягады — на кірмашах прадстаўлены шырокі асартымент свежых пладоў і агародніны ўраджаю 2017 года. На пляцоўцы каля сталічнага Лядовага палаца — пераважна падворкі Гродзенскай і Брэсцкай абласцей.**



Юлія НІКАЛАЕВІЧ прыехала на сталічны кірмаш з вёскі Міжлессе Лунінецкага раёна.

Тавар на любы густ і кошт: таматы — ад BYN1,5 да BYN2,5, перац — BYN0,5—2. Самы «хадавы» тавар — бульба. Набыць яе можна па цане ад 3,5 да 4,5 беларускага рубля. Мяхі — ад кілаграма да дзесяці. Радуюць і суніцы, кошт на іх ад 3,5 да 5,5 рубля. Удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам I групы дастаўка прадукцыі, набытай на кірмашах, ажыццяўляецца бясплатна.

Назапасіцца вітаміннай прадукцыяй па цэнах вытворцаў можна і паблізу жылых дамоў. Ураджайнасць у гэтым годзе, як кажуць аграрыі, дазваляе. Толькі бульбы ў гаспадарках сабрана каля 6 мільёнаў тон. А гародніны і ягад — больш за 2 мільёны.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**





## СВАЯ НОША — НЕ ЦЯЖАР

**Чэмпіянат па пераносе жонак прайшоў у гарналыжным спартыўна-аздараўленчым комплексе «Лагойск».**



Фота БЕЛТА.

Паводле ўмоў спаборніцтваў у ім маглі прыняць удзел 50 пар, неабавязкова жанатыя. Можна было прыхапіць з сабой кавалера або, наадварот, сяброўку. Адзінае абмежаванне — узрост больш за 18 гадоў.

На чэмпіянат прыехалі 12 пар. На дыстанцыі ў 253 метры ім давялося пераадолець бар'еры вышынёй у метр, яму з вадой, кучу пяску. Прычым дзяўчына не павінна была датыкацца нагамі да зямлі або падаць. У гэтым выпадку налічваліся 15 штрафных секундаў. Кажуць, свая ноша не цяжар. Але ж уявіце, як нялёгка даводзілася партнёру, які яшчэ і нёс груз літаральна на сваёй шыі.

Самай хуткай і спрытнай стала сям'я Паўла і Наталлі Леановічаў з горада Мазыра Гомельскай вобласці, якая пераадолела дыстанцыю за 1 мінуту 43,75 секунды. Як прызналіся сужэнцы, яны рэгулярна ўдзельнічаюць у аналагічных спаборніцтвах. На другім месцы Дзмітрый Гідлеўскі і Веранiка Швакава, трэцімі прыйшлі Вадзім Шалкоўскі і Валерыя Клачко.

Арганізавала спаборніцтвы Беларуская федэрацыя гонак з перашкодамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# І ЗНОЎ ПРА ПЕНСІІ

### Працоўны стаж могуць пацвердзіць сведкі

**— Міністэрства сувязі і інфарматызацыі анансавала выпуск ID-карты. Гэта будзе ў тым ліку замена пенсійнага пасведчання і пасведчання інваліда?**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— ID-карта (ідэнтыфікацыйная карта) будзе выступаць універсальным ідэнтыфікатарам грамадзяніна ў межах нашай краіны. З яе дапамогай можна будзе вызначыць статус (катэгорыю) яе трымальніка, у прыватнасці пенсіянера, інваліда, і ягоныя правы. Тым не менш у сувязі з увядзеннем ідэнтыфікацыйнай карты адмена пенсійнага пасведчання на дадзеным этапе не плануецца.

**— Налета мне спаўняецца 61 год, і я магу аформіць пенсію па ўзросце. Працоўная кніжка страчана. Як мне пацвердзіць свой стаж?**

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацабароны Ларыса ЯШКОВА:**

— Пры адсутнасці працоўнай кніжкі ў пацвярджэнне перыядаў работы да 1 студзеня 2003 года прымаюцца даведкі, выдадзеныя работадаўцамі (іх правапераемнікамі) або архіўнымі ўстановамі на падставе загадаў, асабовых рахункаў, ведамасцяў на выдачу заработнай платы і іншых дакументальных даных, якія змяшчаюць звесткі пра перыяды працы. Пры гэтым перыяды працы з 1 ліпеня 1998 года да 1 студзеня 2003 года дадаткова павінны быць пацверджаны даведкай аб заробку з адзначэннем інфармацыі аб выплаце абавязковых страхавых узносаў.

Пры адсутнасці дакументаў аб працы і немагчымасці іх атрымання ў сувязі са спыненнем дзейнасці работадаўца ці па іншых прычынах і адсутнасці архіўных даных перыяды работы да 1 ліпеня 1998 года могуць устанаўлівацца камісіяй па прызначэнні пенсіі на падставе паказанняў не менш як двух сведак. Пры гэтым сведкі павінны не толькі ведаць заяўніка па сумеснай працы, але і мець дакументы аб сваёй працы за той час, у дачыненні да якога яны сведчаць. Устаноўленым лічыцца перыяд, пацверджаны абодвума сведкамі.

Перыяды работы пасля 1 студзеня 2003 года пацвярджаюцца звесткамі індывідуальнага (персаніфікаванага) уліку. Запыт гэтых звестак ажыццяўляецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне без удзелу заяўніка (пры звароце яго па прызначэнне пенсіі).

**— Ці ўключаецца ў патрабаваны стаж працы з выплатай узносаў савецкі стаж?**

**Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— Вядома. У Савецкім Саюзе наёмныя работнікі падлягалі дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню; узносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі. Адпаведна, час работы ў перыяд СССР або так званы савецкі стаж уключаецца ў стаж працы з выплатай страхавых узносаў, неабходны для прызначэння працоўнай пенсіі.

**— Я аформіўся на пенсію па ўзросце, але працягваю працаваць. Калі я буду працаваць некалькі гадоў, мая пенсія стане большай?**

**Ларыса ЯШКОВА:**

— Пенсія можа стаць большай, калі падчас працы вы адмовіцеся ад атрымання пенсіі. Для гэтага неабходна звярнуцца ў орган, які ажыццяўляе ваша пенсійнае забеспячэнне, з адпаведнай заявай. Памер прыбаўкі да прызначанай пенсіі будзе залежаць ад працягласці перыяду працы без атрымання пенсіі. Напрыклад, пяць гадоў працы без атрымання пенсіі дазваляе павялічыць яе памер больш чым у 1,7 раза. Таксама хачу звярнуць увагу, што павелічэнне памеру прызначанай пенсіі прадугледжана толькі для пенсій па ўзросце за перыяды працы пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

### Беспрацоўны можа аформіць пенсію раней, але пры пэўных умовах

**— Я ўжо некалькі месяцаў не працую. Да пенсіі па ўзросце мне яшчэ паўтара года. Ці можна ў такой сітуацыі аформіць пенсію раней?**

**Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— Такая магчымасць заканадаўствам прадугледжана, але пры выкананні пэўных умоў. Законам «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» прадугледжана прызначэнне датэрміновай пенсіі па ўзросце, але не раней чым на адзін год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Прычым грамадзяне павінны быць прызнаныя ва ўстаноўленым парадку беспрацоўнымі, якія маюць права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў (такое права даецца жанчынам, у якіх стаж працы складае не менш за 33 гады, і мужчынам, у якіх стаж працы складае не менш за 38 гадоў).

**2 578 490 беларусаў атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па стане на 1 верасня 2017 года.**

Такім грамадзянам пры адсутнасці магчымасці для працаўладкавання замест дапамогі па беспрацоўі з іх згоды можа быць прапанавана прызначэнне датэрміновай пенсіі па ўзросце.

**— Колькі чалавек у нашай краіне, дасягнуўшы агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, не маюць права на прызначэнне пенсіі з-за недахопу страхавога або агульнага працоўнага стажу? Ці прадугледжаны для іх нейкія прэферэнцыі пры працаўладкаванні, магчыма, прымяняюцца іншыя меры садзейнічання занятасці, каб яны маглі дапрацаваць неабходны стаж?**

**Ларыса ЯШКОВА:**

— Колькасць такіх асоб за перыяд з 2015 года склала каля 3,7 тысячы чалавек. Пытанне забеспячэння іх занятасці (пры іх жаданні) разглядаецца службамі занятасці па месцы жыхарства.

**— Ці залічваюцца гады афіцыйна аформленага догляду інваліда першай групы пры прыняцці рашэння аб прызначэнні пенсіі?**

**Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— Так, такі перыяд залічваецца ў стаж для прызначэння пенсіі.

**— Дагавор аб пенсійным забеспячэнні работнікаў краін Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) можа быць падпісаны ў 2018 годзе. Гэта неяк паўплывае на пенсійнае забеспячэнне беларусаў?**

**Ларыса ЯШКОВА:**

— Праект Дагавора аб пенсійным забеспячэнні работнікаў дзяржаў — членаў ЕАЭС накіраваны на забеспячэнне грамадзянам дзяржаў — членаў ЕАЭС, у тым ліку нашым грамадзянам, магчымасці фарміраваць пенсійныя правы праз выплату страхавых узносаў у перыяд работы на тэрыторыі любой дзяржавы — удзельніцы ЕАЭС, захоўваць і рэалізоўваць гэтыя правы ў далейшым. Так, напрыклад, грамадзянін Беларусі, які працуе на тэрыторыі Арменіі з выплатай страхавых узносаў, пасля ўступлення ў сілу Дагавора будзе мець права ў далейшым атрымаць пенсію за гэты стаж ад Арменіі (пры выкананні ўмоў заканадаўства гэтай дзяржавы). Названая пенсія па выбары грамадзяніна будзе экспартавацца па месцы яго жыхарства ў Беларусі ці выплачвацца ў Арменіі.

**— У перыяд з 1997 па 2001 год быў зарэгістраваны прадпрымальнікам. Узносы ў пенсійны фонд не плаціў, паколькі тады гэта не было абавязковым. Ці ўключаць мне гэты перыяд у стаж для прызначэння пенсіі?**

**Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— Перыяды прадпрымальніцкай дзейнасці, на працягу якіх выплата страхавых узносаў ва ўстаноўленым парадку не ажыццяўлялася, у стаж працы для прызначэння пенсіі і вылічэння яе памеру не ўключаюцца.

**— Ці ўплывае на памер пенсіі беспярэпынны стаж працы на адным прадпрыемстве?**

**Начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацабароны Наталля МУРАШКЕВІЧ:**

— Не, не ўплывае. Пры вылічэнні памеру пенсіі ўлічваецца працягласць наяўнага стажу працы.

**— Я маці дзіцяці-інваліда. Чула, што для прызначэння працоўнай пенсіі ўжо патрабуецца 10 гадоў страхавога стажу. Гэта датычыцца і маці дзяцей-інвалідаў?**

**Наталля МУРАШКЕВІЧ:**

— Умовы прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце бацькам, у прыватнасці маці дзяцей-інвалідаў (інвалідаў з дзяцінства), не змяніліся. Як і раней, працоўная пенсія па ўзросце маці, якія выхоўваюць дзіця-інваліда (інваліда з дзяцінства) не менш за 8 гадоў у перыяд да яго паўналецця, прызначаецца на 5 гадоў раней дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту пры наяўнасці не менш як 5 гадоў стажу працы з выплатай страхавых узносаў і агульным стажы не менш за 20 гадоў. У гэты агульны стаж, акрамя перыядаў работы і іншай дзейнасці з выплатай страхавых узносаў, залічваюцца перыяды догляду дзіцяці-інваліда і інваліда I групы, без абмежаванняў па іх працягласці, а таксама іншыя перыяды дзейнасці, прадугледжаныя часткай другой артыкула 51 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні».

**Падрыхтавала**
**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЯКІ ЁН, БРЭНД БЕЛАРУСІ?

## Спецыялісты палічваюць, што 2018-ы стане Годам турызму Беларусі і Кітая

**Намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл Партной падкрэсліў, што Беларусі неабходны ўласны брэнд. «Але вопыт Мінска сведчыць пра тое, што да гэтага пытання трэба падыходзіць асцярожна і ўзважана, прыцягваць грамадскасць, каб гэтая работа ішла празрыста і сумленна», — адзначыў намеснік міністра. Таму некалькі варыянтаў брэнда Беларусі будуць прапанаваны грамадскасці да канца года.**

### Кітайскі вектар

Беларусь і Кітай у наступным годзе акцэнтуюць увагу на развіцці турызму. «Калі ўсё атрымаецца, у лістападзе на палях саміту «16 + 1» мы аб'явім 2018-ы Годам турызму Беларусі і Кітая. Плануецца, што адпаведнае пагадненне будзе падпісана на ўзроўні прэм'ер-міністраў нашых краін», — сказаў Міхаіл Партной.

Цяпер рыхтуецца план мерапрыемстваў. «У ім будзе ўлічана ўсё: лагістыка, харчаванне, пражыванне, інфармацыйная кампанія. Мы плануем правесці шмат мерапрыемстваў у 2018 годзе. Супрацоўніцтва будзе выгадным для нашых дзяржаў, таму што беларусы з задавальненнем ездзяць у Кітай, а Кітаю падабаецца наша еўрапейская краіна», — адзначыў намеснік міністра.

А яшчэ грамадзянам Кітая плануецца дазволіць 30-дзённы бязвізавы ўезд у Беларусь. «Разглядаецца пытанне аб увядзенні бязвізавага рэжыму для грамадзян Кітая па грамадзянскім пашпарце на 30 сутак», — адзначыў Міхаіл Партной. Паводле яго слоў, цяпер над гэтым пытаннем актыўна працуюць знешнепалітычныя ведамствы дзвюх краін. «Хацелася б, каб да канца года гэтыя пытанні былі закрытыя. Мы вельмі шчыльна над гэтым працуем», — падкрэсліў намеснік міністра.

### Бязвіз з 5 да 10 дзён

Спецыяльным бязвізавым рэжымам для ўезду ў Беларусь з моманту яго ўвядзення скарысталіся 52 тысячы турыстаў, паведаміў Міхаіл Партной. Ён адразу ўдакладніў, што ў цяперашні час разглядаецца пытанне аб павелічэнні тэрміну бязвізавага знаходжання ў Беларусі — пакуль ідзе гаворка пра 10 сутак.

«Нас не задавальняюць 5 сутак. Асабліва гэта датычыцца медыцынскага, спартыўнага турызму. Гэтага часу мала. Але гэта быў пілотны праект, ён звязаны з бяспекай, таму што ў турызме гэта вельмі важна. Цяпер, калі сістэма бяспекі абкатаная, вядзём гаворку пра павелічэнне колькасці дзён да 10. Спадзяюся, да Еўрапейскіх гульняў гэта атрымаецца», — сказаў Міхаіл Партной.

Пры гэтым намеснік міністра падкрэсліў, што пакуль рашэнне па павелічэнні тэрміну бязвізавага рэжыму не прынята, Беларусь удасканальвае наяўны механізм. «Напрыклад, ёсць эксперыментальны ўказ па Аўгустоўскім канале, цяпер нашы прапановы — акрамя Аўгустоўскага канала зрабіць бязвізавай зонай чыгуначны вакзал і аэрапорт у Гродне, частку Белавежскай пушчы. Брэст хоча рушыць наперад у гэтым напрамку», — растлумачыў ён. Намеснік міністра канстатаваў, што прыняцце такіх рашэнняў дае эканамічны эфект.

Паводле яго слоў, распрацоўваюцца магчымасці распаўсюдзіць бязвіз на ўезд не толькі праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

### На выстаўку «Турбізнес-2017»

Уязны і ўнутраны турызм стануць асноўнымі тэмамі міжнароднай выстаўкі «Турбізнес-2017», якая адкрыецца ў гэту сераду, у Сусветны дзень турызму. Зарэгістравалася ўжо каля 13 краін. Міжнародная выстаўка 24-ы раз пройдзе ў Мінску з 27 па 29 верасня. Традыцыйна на ёй падводзяцца вынікі летняга сезона. Тэматыка экспазіцый — уязны і выязны, спартыўны і прыгодніцкі, рэкрэацыйны, медыцынскі, сямейны, дзіцячы і паляўнічы турызм. На выстаўцы пакажуць спартыўную і турыстычную вопратку, абсталяванне, картаграфічную і сувенірную прадукцыю. Будуць прадстаўлены тураператары і турагенты, транспартныя кампаніі. Праграма прадугледжвае прэзентацыі, круглыя сталы, семінары па актуальных праблемах турыстычнай галіны.

Выстаўку праводзіць Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» сумесна з Міністэрствам спорту і турызму. Летась у ёй прымалі ўдзел прадстаўнікі 14 краін.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

# ЗЯЛЁНАЕ КОЛА, «ДАРОЖНЫЯ ГІСТОРЫІ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я ўжо гадоў 40 як займаюся драўлянай архітэктурай, народным дойлідствам. На той перыяд, калі абследаваў гэтыя мясціны (другая палова 80-х), многае ўжо было страчана. У тыя гады я працаваў у рэстаўрацыйна-праектным інстытуце і ініцыяваў па прыкладзе скандынаўскіх гарадоў рэстаўрацыю гістарычных прадмесцяў. Цэнтр горада абведзены гістарычным зялёным колам з жылымі дамамі, старымі дрэвамі, садамі: Уборкі, Пярэспы, Татарскае, Яўрэйскае, Лютэранскае прадмесці, Добрыя Думкі (прыпынак электрычкі Інстытут культуры), Ніжняя і Верхняя Ляхаўка, Кашары, а замыкалася яно Камароўкай. Быў распрацаваны праект, які ў лютым 1988 года падтрымаў горадабудаўнічы савет, і Міністэрства культуры дало заказ рэстаўрацыйна-праектнаму інстытуту абследаваць 50 найбольш каштоўных дамоў. Такая праца была праведзена, дамы браліся з розных прадмесцяў. Пасля былі і іншыя праекты, але надышлі 90-я гады, інфляцыя... За бясцэнак старадаўнія дамы растасквалiся па дачах. Калі яны разцягваліся, трывалае, стагадовае смалістае дрэва было чырвонае, як медзь...

**— Але ж асобныя мінскія дамы-старажылы яшчэ жывыя і сёння. Ці можна што з імі зрабіць?**

— Захаваць такія дамы было практычна немагчыма. Гэта праблема прыватнай уласнасці. Калі б у савецкі час у нас былі, як на Захадзе, прадстаўнікі сярэдняга класа: лавачнікі, рамеснікі, булачнікі, гандляры півам, якія валодалі б гэтымі дамамі, магчыма, сітуацыя была б іншая... Для прыкладу: у пачатку 90-х гадоў да нас прыехаў госць з Англіі з мэтай купіць этнаграфічныя экспанаты. У яго сядзіба (ферма) XVI стагоддзя, якую дзяржава ўключыла ў спіс нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны і выдзяляе грошы, каб ён яе захоўваў, падтрымліваў у прыстойным стане. Ён не спецыяліст-музейшчык, і ад яго гэта і не патрабуецца. Ездзіць па Еўропе, збірае ў розных краінах старажытнасці, вывешвае аб'явы і прымае турыстаў, якія яму за гэта плацяць грошы. У нас падобнага механізма, які даваў бы дзяржаве права фінансаваць такую прыватную ўласнасць, не было. Хоць гэту праблему ў канцы 80-х спрабавалі рашыць. Важна, каб людзі маглі пацягнуць рамонт старых будынкаў, бо калі сметчыкі аблічвалі праектныя работы, атрымліваліся вельмі вялікія сумы. Неабходна малая будаўнічая інфраструктура, пэўныя арганізацыі, якія маглі б гэтым займацца, і каб накладныя расходы былі невялікімі.

### Эх, дарогі

*За мяжой пасля Другой сусветнай вайны быў распрацаваны шэраг праграм па захаванні гістарычнага ландшафту, гісторыка-культурнай спадчыны. Тады пачалі стварацца агламерацыі, узніклі такія паняцці, як «Вялікі Лондан», «Вялікі Парыж», Нью-Ёрк з прыгарадамі. Калі ствараліся трасы, дарогі стратэгічнага маштабу, напрыклад ад Парыжа да межаў краіны, улічвалася ўсё: і прыгожыя пейзажы, і відавыя пункты, дзе можна спыніцца і пафатаграфаваць; аднаўляліся помнікі, фрагменты старажытных дарог, нават паказальнікі былі пра тое, што, напрыклад, за 10 кіламетраў стаяць дубы, якія намаляваў пэўны мастак XVIII стагоддзя. Прыродная і гісторыка-культурная інфраструктура разглядалася з пункту гледжання заробку грошай.*

*Пастунова і Мінск ператворыцца ў агламерацыю, сюды будуць уключаны Фаніпаль, Смілавічы, Заслаўе. Дарэчы, такая агламерацыя праектавалася яшчэ ў 50-я (!) гады, прычым амаль у межах Мінскай вобласці.*

— Да 80-х гадоў у нас многа дзе яшчэ былі дарогі з брукаванкай і спецыяльным каменем, што выраблёўся ў выглядзе шасціграннiка пад Пінскам. Гэтыя дарогі былі шчыльна абсаджаныя старадаўнімі дрэвамі, кроны якіх змыкаліся. Напрыклад, так было пад Гальшанамі, Глускам, Клецкам, па дарозе Нясвіж — Гарадзея. Гэта былі прыгожыя мясціны, дзе вандроўнікі маглі б летам спыняцца і адпачываць у цені, — расказвае Аляксандр Іванавіч. — Зразумела, жыццё не спыніш, ездзіць трэба з хуткасцю 120 км за гадзіну, патрэбны сучасныя трасы. Але я прапаноўваў дарожнаму ведамству захаваць кавалкі старых дарог хоць бы ў метраў 500, а аўтабан пускаць у абход...

**— Што сёння мы, магчыма, упускаем у турыстычнай галіне?**

— Трэба ахоўваць старажытныя паркі. Многія з іх ператварыліся ў дзяржлесфонд. Пры распрацоўцы турыстычных маршрутаў варта ўлічваць сельскія ландшафты. На жаль, пакуль ў гэтым не бачаць ніякай каштоўнасці, людзі не спяшаюцца прывесці ў парадак той жа кавалак брукаванкі ці гарадзішчы. Апошнія можна абкасіць, прыбраць кустоўе, пабудаваць відавыя пляцоўкі, куды маглі б заязджаць турысты, паставіць шчыты з інфармацыяй. Напрыклад, так можна было б зрабіць з гарадзішчам Лоск у Валожынскім раёне, з гарадзішчам Менка пад Мінскам.

Больш за тое, я прапаноўваў на аўтазаправачных станцыях паставіць стэнды з інфармацыяй, якія гісторыка-культурныя каштоўнасці ў мясцовых ваколіцах можна наведаць. Гэта таксама працавала б на развіццё турызму.

Гасцям сталіцы на аглядных экскурсіях трэба расказваць не пра музеі, галерэі (пра ўсё гэта яны пачуюць непасрэдна на месцах) і не толькі пра выдатныя мясціны горада, — трэба знаёміць з нашай краінай, рэкламаваць перыферыю, каб турыстам захацелася паехаць, напрыклад, на Гродзеншчыну, паглядзець Гервяты, Міхалішкі, Варняны, Дзятлава, Будслаў, Гродна. У нас заходнія гарады, блізкая і зразумелая еўрапейцам культура. Мы частка агульнаеўрапейскага дома.

**— Зараз актыўна выкарыстоўваюцца падзейны турызм, анімацыйныя экскурсіі. Ці можна яшчэ нешта да гэтага дадаць?**

— Цудоўна, што ў Мінску ладзяцца праграмы нацыянальных культур каля Ратушы. Але многае ў летні час можна было б рабіць і ў Музеі народнай архітэктуры і побыту пад адкрытым небам, дзе больш месца, і людзі б ехалі, бо сёння ў многіх ёсць машыны. Добра было б арганізаваць там спеўнае поле, дзе б гучалі нашы традыцыйныя народныя песні, якія выхоўваюць у людзях духоўнасць.

**— А што экскурсаводы павінны расказваць пра сам Мінск?**

— Апошнія амаль дзесяць гадоў распрацоўваецца праект рэканструкцыі гістарычнага цэнтра з археалагічным, архітэктурным музеем і інтэрактыўнымі праграмамі, наш цэнтр таксама прымаў удзел у яго распрацоўцы. Але пакуль ён не рэалізаваны, было б добра, каб, напрыклад, у тым месцы, дзе сёння гандлююць народныя майстры, з'явіўся стэнд з макетам, побач з якім экскурсаводы маглі б турыстам расказваць пра гісторыю старажытнага Мінска. Напрыклад, так робіцца ў Англіі. Там таксама многа разбурана, і хоць гэта багатая краіна, яна не ў стане ўсё аднавіць, рэканструяваць. Тады з бронзы адліваецца макет дыяметрам 2—3 метрыа, і тут расказваюць, якія на пэўным месцы некалі былі пабудовы, храмы, вароты. Акрамя таго, падобныя макеты будуць нагадваць, што рана ці позна трэба брацца за рэканструкцыю.

### Узорны сацыялістычны

*Сталічны праспект Незалежнасці прэтэндуе на статус аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. І калі хто з журналістаў да Аляксандра Іванавіча звяртаецца па каментарый і кідае слоўцы накшталт «гэта ж сталінскі ампір, архітэктура дыктатара», вучоны адказвае: «Над аднаўленнем Мінска працавалі таленавітыя мастакі — патрыёты вялікай краіны, якая перамагла ў Айчыннай вайне, і Беларусі ў тым ліку». Трэба сказаць, што вобраз сацыялістычнага горада не нарадзіўся ў СССР. Ён узнік разам з індустрыяльнай рэвалюцыяй у Еўропе. У гарадах з'явілася вялікая колькасць прадстаўнікоў новага сацыяльнага саслоўя — рабочых, для іх трэба было будаваць мікрараёны з дзіцячымі садамі, школамі, бальніцамі, крамамі, паркамі. Архітэктары Англіі, Францыі і іншых краін распрацавалі ідэю горада-саду, сацыялістычнага горада.*

— Адразу пасля вайны стаяла пытанне, ці варта аднаўляць разбураны амаль дазвання Мінск. І ўявіце: Панамарэнка сустрэўся са Сталіным на платформе мінскага вакзала. Бачачы сітуацыю, Сталін сказаў, што краіна дапаможа аднавіць горад. Сюды былі накіраваныя найлепшыя архітэктары, тут распрацавалі касцяк генплана 46-га года. Пры яго падрыхтоўцы ўлічылі ўсе плюсы і мінусы сусветных сталіц, напрыклад недахопы таго ж Неўскага праспекта ў Піцеры, Цвярской, якая не выконвала ролю галоўнага праспекта ў Маскве, той жа крывы і даволі кароткі Крашчацік у Кіеве. Па сутнасці, за аснову быў узяты варыянт Елісейскіх палёў у Парыжы. Шырокі праспект, тратуары былі прызначаныя ў тым ліку для масавых шэсцяў. Да пастанаўлення аб архітэктурных празмернасцях шмат ужо было зроблена.

Так, гэта вобраз сацыялістычнага горада. Сацыялізм абапіраўся на дзяржаўную прыватнасць, прыватны бізнес маштабу не меў. Асноўныя будынкі праспекта не маюць лавак, навесаў, маркізаў. Не было ніякай драбязы, на першых паверхах размяшчаліся буйныя дзяржаўныя ўнівермагі, кніжныя крамы, кафэ.

Замежныя архітэктары, якія прыязджаюць у Мінск, заўсёды адгукаюцца вельмі добра пра наш праспект, кажуць, што ён варты работ Персье і Фантэна (архітэктараў, якія стварылі Трыумфальную арку, забудову вуліцы Рывалі ў Парыжы, забудоўвалі Елісейскія палі).

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления**

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, росс. руб. | Задаток, росс. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Апартамент №001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь –101,2 кв. м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот №2 | Апартамент №002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 59,7 кв. м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот №3 | Апартамент №003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 61,2 кв. м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот №4 | Апартамент №004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение кв. м нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 99,6 кв. м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот №5 | Апартамент №101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 101,7 кв. м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот №6 | Апартамент №104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 100,8 кв. м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот №7 | Апартамент №201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №8 | Апартамент №202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв. м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот №9 | Апартамент №203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №10 | Апартамент № 204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв. м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот №11 | Апартамент №205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №12 | Апартамент №206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №13 | Апартамент № 208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №14 | Апартамент №209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв. м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот №15 | Апартамент № 210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №16 | Апартамент №211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №17 | Апартамент №301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №18 | Апартамент №302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №19 | Апартамент №303 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №20 | Апартамент №305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №21 | Апартамент № 306 (2– комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот № 22 | Апартамент №308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №23 | Апартамент №309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №24 | Апартамент № 310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №25 | Апартамент №311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №26 | Апартамент №401 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №27 | Апартамент №402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 28 | Апартамент №403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №29 | Апартамент №404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв. м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот №30 | Апартамент №405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 717, 10 |
| Лот №31 | Апартамент №408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №32 | Апартамент №409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №33 | Апартамент № 410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №34 | Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 35 | Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №36 | Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №37 | Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №38 | Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 171,10 |
| Лот №40 | Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №41 | Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №42 | Апартамент №511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 43 | Апартамент №601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №44 | Апартамент №602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 46 | Апартамент №609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №47 | Апартамент №610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №48 | Апартамент №611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №49 | Апартамент №701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207, 60 |
| Лот №50 | Апартамент №702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 51 | Апартамент №703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7–ой. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 52 | Апартамент № 710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №53 | Апартамент №711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №54 | Апартамент №801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №55 | Апартамент №802 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №56 | Апартамент №803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №58 | Апартамент №810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №59 | Апартамент №811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №60 | Апартамент № 901 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №61 | Апартамент №902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №66 | Апартамент №1001 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 347,7 кв. м | 51 158 074,00 | 5 115 807,40 |
| Лот №67 | Апартамент №1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 344,0 кв. м | 50 614 082,00 | 5 061 408,20 |
| Лот №68 | Апартамент №1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №69 | Апартамент №1004 (2-комнатный 2-уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 139,0 кв. м | 21 983 837,00 | 2 198 383,70 |
| Лот №70 | Апартамент №1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №71 | Апартамент №1010 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №72 | Апартамент №1011 (4-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв. м | 36 400 333,00 | 3 640 033,30 |
| Лот №73 | Апартамент №1101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв. м | 17 127 889,00 | 1 712 788,90 |
| Лот №74 | Гаражный бокс №1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №75 | Гаражный бокс №2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,5 кв. м | 1 342 132,00 | 134 213,20 |
| Лот №80 | Гаражный бокс №7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,2 кв. м | 1 332 137,00 | 133 213,70 |
| Лот №81 | Гаражный бокс №8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №84 | Гаражный бокс №11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,4 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №85 | Гаражный бокс №12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 11,3 кв. м | 1 316 432,00 | 131 643,20 |
| Лот №86 | Гаражный бокс №13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №87 | Гаражный бокс №14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №88 | Гаражный бокс №15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №89 | Гаражный бокс №16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,1 кв. м | 1 330 710,00 | 133 071,00 |
| Лот №90 | Гаражный бокс №17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 11,7 кв. м | 1 319 287,00 | 131 928,70 |
| Лот №91 | Гаражный бокс №18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,5 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №92 | Гаражный бокс №19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,1 кв. м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот №93 | Гаражный бокс №20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №96 | Гаражный бокс №23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,3 кв. м | 1 340 704,00 | 134 070,40 |
| Лот №97 | Гаражный бокс №24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 15,9 кв. м | 1 353 554,00 | 135 355,40 |
| Лот №98 | Гаражный бокс №25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение – нежилое Этаж – подвал №3. Площадь – 12,4 кв. м | 1 324 998,00 | 132 499,80 |
| Лот №99 | Гаражный бокс №26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №102 | Гаражный бокс №29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,7 кв. м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот №106 | Гаражный бокс №43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение – нежилое. Цокольный этаж №2. Площадь – 11,7 кв. м | 1 359 266,00 | 135 926,60 |

ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым № 23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв. м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория

УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по **06.10.2017 г.** В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа – российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка на участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов)

**Аукцион состоится 12.10.2017 г. в 10.00 по мск по адресу: Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс–зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС–Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а.

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр-т Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), проводимом 12 октября 2017 г.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:

– в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 06.10.2017 до 12.00 по белорусскому времени;

– в г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс–зал в здании главного корпуса 11.10.2017 г. с 10.00 до 13.00 по мск. Для этого потенциальному участнику необходимо не позднее 06.10.2017 г. по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в г. Сочи и представить копию платежного документа о перечислении задатка.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович, тел.: 8-10-7-862-259-60-02 , 8-10-7-862-259-60-12, 8-10-7-928-451-31-69.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Справы духоўныя

# Падзея, беспрэцэдэнтная для гісторыі

## У гэтыя дні ў беларускую сталіцу завітаюць каталіцкія іерархі з усёй Еўропы



**На гэтым тыдні, 28 верасня — 1 кастрычніка ў Мінску будзе праходзіць пленарнае пасяджэнне Рады Канферэнцый біскупаў Еўропы (РКБЕ) — найбольш уплывовай касцельнай арганізацыі ў Еўропе. Наша краіна ўпершыню стане гаспадыняй пасяджэння РКБЕ. Яно будзе прысвечана моладзі і будучыні кантынента як супольнага дома. Рашэнне аб правядзенні было прынята падчас мінулагодняга падобнага форуму кіраўнікоў каталіцкіх епіскапатаў Еўропы, які праходзіў 6—9 кастрычніка 2016 года ў княстве Манака, паведамляецца на партале catholic.by.**

У апублікаваным звароце **Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, старшыня Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі,** адзначыў, што правядзенне пленарнага пасяджэння — гэта вялікі гонар як для Касцёла ў Беларусі, так і для нашай краіны ў цэлым. «Падзея, якая чакае нас, з'яўляецца беспрэцэдэнтнай у гісторыі каталіцкага Касцёла і нашай Бацькаўшчыны. Яшчэ ніколі Беларусь адначасова не наведвала паўсотні вышэйшых іерархаў каталіцкага Касцёла старога кантынента», — лічыць ён.

На думку іерарха, у той жа час гэта і вялікая адказнасць, якая ўскладаецца на каталіцкі Касцёл у Беларусі, які летась адзначыў сярэбраны юбілей свайго адраджэння. Надыходзячы форум — гэта прызнанне ролі каталіцкага Касцёла як у нашай краіне, так і ў Еўропе. А таксама знак салідарнасці еўрапейскіх католікаў з беларускімі і павагі да нашай краіны. «Трэба прызнаць, што не апошнюю ролю ў выбары месца правядзення Пленарнага пасяджэння Рады Канферэнцый біскупаў Еўропы, акрамя дынамічнага працэсу адраджэння Касцёла, адыгралі добрыя адносіны з рознымі веравызнаннямі, асабліва з праваслаўнай Царквой, і таксама канструктыўны дыялог з дзяржаўнымі ўладамі і грамадствам», — адзначыў арцыбіскуп.

Іерарх запрасіў духавенства і вернікаў прымаць удзел у набажэнствах з удзелам старшынь біскупскіх канферэнцый Еўропы, якія адбудуцца ў наступных мінскіх касцёлах: 28 верасня ў 19.00 у касцёле Святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл), 29 верасня ў 18.30 у касцёле Імя Найсвяцейшай Панны Марыі (архікатэдра), 30 верасня ў 18.30 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы (Залатая Горка).

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**Даведачна**

**Рада Канферэнцый біскупаў Еўропы бярэ свой пачатак з 1965 года, калі падчас сустрэчы 13 кіраўнікоў нацыянальных епіскапатаў у Рыме быў заснаваны камітэт, накіраваны на развіццё магчымасцяў для больш цеснага супрацоўніцтва на ўзроўні мясцовых епіскапатаў. Устаноўчы сход Рады адбыўся 23—24 сакавіка 1971 года.**

■ Тэхналогіі

# ЗАМЕСТ ПАШПАРТА — СУЧАСНАЯ «ЧЫПАВАНАЯ» КАРТА?

**Беларуская інтэграваная сэрвісна-разліковая сістэма (БІСРС) павінна запрацаваць у ліпені наступнага года, паведаміў міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ.**

### Тэставыя ID-карты атрымаем ужо ў красавіку

Міністр адзначыў, што праект дазволіць забяспечыць замену ўнутранага пашпарта грамадзяніна Беларусі на ID-карту. Яна стане паўнавартасным сродкам ідэнтыфікацыі грамадзян. Лічыцца што ID-карта будзе мець дзве асноўныя функцыі — заменіць беларускі пашпарт, а таксама стане ключом-доступам грамадзяніна для атрымання розных відаў электронных адміністрацыйных паслуг. «Такія карты ёсць у многіх краінах свету, і калі будуць прыняты адпаведныя міжурадавыя пагадненні, па ID-карце можна будзе перасякаць межы нашай краіны. Акрамя таго, у далейшым карта зможа замяніць розныя віды дакументаў, напрыклад правы кіроўцы», — паведаміў Сяргей Папкоў.

Міністр растлумачыў, што першы этап рэалізацыі праекта практычна завершаны. Падрыхтавана тэхнічнае заданне, у хуткім часе міжведамасная рабочая група ўзгоніць яго.

І тады будзе аб'яўлены конкурс на распрацоўку апаратна-праграмнага комплексу БІСРС. На словах Сяргея Папкова, у тэставым рэжыме сістэму плануецца запусціць у красавіку. А з 1 ліпеня пачнецца камерцыйная эксплуатацыя сістэмы, да гэтага часу першыя карты будуць ужо выдаваць кліентам. Гэтым будзе займацца Міністэрства ўнутраных спраў. Сістэма наймагутная, складаная,таму патрэбен час, каб яе выпрабаваць.

### Лічбавы гандаль

Другой найважнейшай задачай галіны Сяргей Папкоў лічыць распрацоўку Нацыянальнай сістэмы беспапяровага гандлю (НСБГ). А стварэнне тэхнічнага задання гэтай сістэмы плануецца завяршыць у лістападзе—снежні.

Работа ў гэтым кірунку вядзецца ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам навукі, інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій і перспектыўнага развіцця Рэспублікі Карэя. «Заключана пагадненне з паўднёвакарэйскім Нацыянальным агенцтвам інфармацыйнага грамадства. Мы стварылі беларуска-карэйскі кансалтынгавы цэнтр. І ў нас ёсць трохгадовая праграма ўзаемадзеяння», — растлумачыў міністр.



Ва Украіне ўжо карыстаюцца ID-картамі замест пашпартоў.

У выніку рэалізацыі праекта ў Беларусі будзе створана лічбавая інфраструктура арганізацыі электроннага (беспапяровага) узаемадзеяння ўсіх удзельнікаў знешнегандлёвых адносін — пачынаючы ад вытворчасці тавараў і заканчваючы іх рэалізацыяй. Паводле экспертных ацэнак, укараненне НСБГ дазволіць знізіць выдаткі на знешнеэканамічныя аперацыі ў 2 разы. Як паведаміў Мінсувязі, тэрмін стварэння сістэмы — прыкладна 4 гады. На гэтыя мэты будзе выдаткавана каля 10 млн долараў. А акупіцца праект на працягу 5 гадоў.

### Роўмінг паміж РБ і РФ будзе мінімальны

Цяпер вядзецца работа, каб сфарміраваць адзіную тарыфную палітыку на ўваходныя званкі ў межах ЕАЭС. Трэба адзначыць, што цана пры тэлефанаванні ў іншую краіну будзе нязначна, але адрозніваецца. Выпрацаваць адзіную тарыфную палітыку неабходна да 2020 года.

Міністр удзельнічаў у Форуме рэгіёнаў, які адбыўся ў чэрвені ў Маскве, і падкрэсліў: «Там было даручэнне кіраўнікоў дзяржаў прапрацаваць пытанне (па адмене роўмінгу паміж Беларуссю і Расіяй). Мы з расійскімі калегамі гэтае пытанне разглядаем. Пытанне складанае, але пэўныя крокі зроблены, апаратары сувязі паміж сабой дамовіліся аб зніжэнні цаны роўмінгавых паведамленняў». Пры гэтым ён дадаў, што пра нулявы кошт званкоў гаворка не ідзе.

### Стандарт LTE ўжо сёлета

Сёння паслугі сотавай рухомай электрасувязі стандарту LTE даступныя 60% насельніцтва. «Да канца года мы забяспечым практычна ўсе раённыя цэнтры гэтай тэхналогіяй», — адзначыў міністр. Сяргей Папкоў падкрэсліў, што ў Беларусі працягваецца развіццё сеткі сотавай рухомай электрасувязі. Мабільнай сувяззю трэцяга пакалення ахоплена 96,5% тэрыторыі краіны, на якой пражывае 99,9% насельніцтва.

Аказанне паслуг мабільнай сувязі чацвёртага пакалення было пачата ў снежні 2015 года. Сёння электрасувязь стандарту LTE даступная жыхарам сталіцы, абласных цэнтраў і буйных раённых цэнтраў.

А вось тэхналогія 5G будзе ўкаранёная ў Беларусі адразу пасля яе міжнароднай стандартызацыі. «Часавыя рамкі выхаду стандарту ў свет — 2019 год. Тое абсталяванне, якое ўсталёўваецца сёння на сетках beCloud, МТС, кампаніі «Бест», здольна з вызваленнем у камерцыйную эксплуатацыю тэхналогій 5G іх падхапіць», — сказаў Сяргей Папкоў.

Таксама стаіць задача ў поўнай меры развіваць HD-тэлебачанне. «Мы павінны да ІІ Еўрапейскіх гульняў забяспечыць якасную карцінку для прагляду грамадзянамі таго кантэнту, які рыхтуюць нашы тэлерадыёкампаніі», — адзначыў міністр. Далейшае развіццё атрымаюць частоты, якія вызваліліся пасля закрыцця аналагавага тэлебачання. Па словах міністра, яны выдаюцца тым, хто жадае развіваць FM-вяшчанне як на мясцовым, так і на рэспубліканскім узроўні. Міністр праінфармаваў, што па выніках першага паўгоддзя сёлета агульная колькасць абанентаў і карыстальнікаў стацыянарнага шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт склала больш за 3,1 млн.

### Тэхналогія GPON у кожны дом

«Мы актыўна працуем, пераходзім на новыя тэхналогіі так званай апошняй мілі — GPON-тэхналогіі. Да канца 2018 года наш нацыянальны аператар «Белтэлекам» усю шматкватэрную забудову краіны забяспечыць аптычнымі ўключэннямі. Гэта дасць магчымасць у поўнай меры задаволіць усе запыты на паслугі як тэлефаніі і лічбавага тэлебачання, так і перадачы даных, уключаючы новую канцэпцыю паслуг «Разумны дом», — расказаў Сяргей Папкоў.

Колькасць абанентаў, падключаных па тэхналогіі GPON, за студзень—чэрвень павялічылася на 300 тысяч. Іх агульная колькасць на 1 ліпеня сёлета склала 1,39 млн.

Яшчэ міністр адзначыў, што вядзецца работа над канцэпцыяй «разумнага горада», каб аб'яднаць усе крыніцы інфармацыі, якія знаходзяцца ў аб'ектах грамадскага прызначэння.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Здаровае харчаванне

# ГРЫБЫ — ЕЖА ЦЯЖКАЯ?



**Ужываць грыбы, вядома, можна. Праўда, дзецям, пажылым і людзям з рознымі хранічнымі захворваннямі — усё ж такі з асцярожнасцю. І ў любым выпадку не мяхамі і адмысловай якасці. Як любы прадукт харчавання, праўда, з пэўнымі ўдакладненнямі, бо мы іх здабываем самастойна, у лесе, а лес — не магазін, дзе бяспеку тавараў гарантуюць спецыяльныя службы. Тут мы самі сабе гарант.**

### ВЫДАТНЫ БЯЛОК?

Ужываем мы грыбы рэдка, таму і ферментаў для іх пераварвання выпрацоўваецца мала. Атрымліваецца, ежа гэта цяжкая для арганізма, і, каб палегчыць нагрузку на яго, дыетолагі рэкамендуюць вымочваць дары лесу, добра варыць і абавязкова здрабняць.

— Асноўным прадуктам на талерцы іх не назавеш. Грыбы дадзены нам для разнастайнасці — з іх можна рабіць соусы, дадаваць у мясныя, мучныя стравы, супы, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Васіль ЦЫГАНКОЎ.** — Тое, што грыбы крыніца выдатнага бялку, — міф. Ён вельмі слаба засвойваецца. Да бялкоў з высокай харчовай каштоўнасцю адносяцца, як вядома, бялкі мяса, рыбы, малака, яек, а таксама капусты і бульбы. Сярод круп найбольш каштоўныя па сваім амінакіслотным складзе бялкі аўсянай крупы, рысу, грэцкай крупы (проса, манная і ячная крупы валодаюць меншай спажыўнасцю).

### ТАКСІЧНАЯ ГУБКА

Грыбніца ўсмоктвае ў сябе ўсё, што змяшчаецца ў глебе, прычым нават у самой глебе, вадзе і раслінах розных таксічных рэчываў можа быць у некалькі разоў менш, чым у грыбах. Любыя прыродныя катаклізмы, напрыклад узгаранне лясоў, абавязкова адбіваюцца на іх. Лясны подсціл з'яўляецца і своеасаблівым экранам для выпаўшых радыенуклідаў, асноўная колькасць якіх змяшчаецца ў самых верхніх слаях, у тым ліку ў імху, лішайніку, ягадах і грыбах. Калі радыяцыйны кантроль паказаў значнае забруджанне грыбоў на нейкім участку лесу, то можна не хадзіць туды яшчэ шмат гадоў.

Наогул у любым выпадку нашы грыбы рэкамендуецца вымачыць на працягу некалькіх гадзін у салёнай вадзе. Варыць таксама ў падсоленай вадзе, мяняючы яе кожныя 15 хвілін на свежую. Дадаванне ў ваду сталовага воцату або лімоннай кіслаты павялічвае пераход радыенуклідаў з грыбоў у адвар, які абавязкова трэба зліваць. Смакавыя вартасці, вядома, мяняюцца, але ж тут трэба выбіраць: смачна ці бяспечна.

### КАЛІ НЕ РАЗБІРАЕШСЯ...

З пачатку года ў краіне атруціліся грыбамі каля сотні чалавек, ёсць нават лятальны зыход. Больш за ўсё такіх выпадкаў у Мінску і Магілёўскай вобласці. Атручэнні ядавітымі грыбамі вельмі цяжкія. Моцнадзеючы яд не разбураецца пры кулінарнай апрацоўцы.

Паводле слоў **загадчыцы аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Віі ШУКЕВІЧ,** праз 3—12 гадзін пасля ўжывання грыбоў у ежу ўзнікае рэзкі боль у жываце, ваніты, дыярэя, слабасць, да якіх праз нейкі час далучаюцца сутаргі і галюцынацыі. Атруціцца можна у тым ліку і ўмоўна-ядомымі грыбамі — некаторымі відамі сыраежак, свінух, ваўнянак, падгруздкаў, калі іх няправільна гатаваць. Іх неабходна мінімум двойчы адварваць, кожны раз па 50 хвілін. Абодва разы прамываць праточнай вадой. Вострае атручэнне можа быць і ад ядомых дароў лесу, калі яны доўга знаходзіліся без кулінарнай апрацоўкі, а таксама ад сырых і недавараных.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

- ✓ **Збірайце толькі вядомыя грыбы. Падазроныя ніколі не каштуйце на смак.**
- ✓ **Пераспелы, паляжалы доўгі час без апрацоўкі ядомы грыб можа стаць атрутным.**
- ✓ **Саліць, сушыць, марынаваць кожны від трэба асобна.**
- ✓ **Не купляйце з рук грыбныя кансервы хатняга гатавання, салаты з грыбамі.**

алімпіец
ЗВЯЗДА
выпуск №9 (58)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



## Аляксандр ЧЭРНІК:

■ Асоба

# «Футболку на сабе не рваў, але да гульні ў зборнай заўсёды стаўлюся з вялікай павагай»

**Чэмпіянат краіны па міні-футболе ўжо стартаваў. А ў пачатку кастрычніка ў Мінску ўпершыню ў гісторыі пройдзе асноўны этап Кубка УЕФА, дзе разам з маскоўскім «Дынама», італьянскім «Пескара» і казахстанскім «Кайратам» згуляе беларуская «Сталіца». Незадоўга да гэтых сустрэч мы пагаварылі з Аляксандрам Чэрнікам. Капітан зборнай і «сталічнікаў» ацаніў старт свайго клуба ў гэтым сезоне, успомніў сваю легіянерскую кар'еру і расказаў пра першую акадэмію міні-футбола ў Беларусі, якая была створана па яго ініцыятыве.**




***— Аляксандр, раскажыце, як прайшла падрыхтоўка да цяперашняга сезона і непасрэдна пра яго старт?***

— Задача трэнераў і гульцоў — набраць добрую форму да старту сезона, лічу, што мы з ёй справіліся, бо ў першых чатырох турах атрымалі перамогі ва ўсіх матчах, а гулялі, у тым ліку і з моцнымі саперкікамі. Кантрольныя матчы ў Маскве прайгралі, але там і сапернік быў прыстойны — КПРФ, моцная каманда расійскай Суперлігі. Вядома, як у чэмпіёна краіны, у нас вялікія амбіцыі і прайграваць нават і такому клубу было вельмі крыўдна.

**«У Расіі ў адным клубе нават прапаноўвалі прыдумаць якую-небудзь траўму, заахвоціць фінансава, каб я не ехаў у зборную».**

***— Але ж пазней прайгралі яшчэ і Суперкубак «Дарожніку».***

— У Оршы прайгравалі саперніку 0:2, але праявілі характар і зраўнялі лік, саступілі толькі па пенальці. Не буду хаваць, непрыемна было аддаваць кубак, бо ў «Сталіцы» ў кожным турніры і матчы стаяць самыя высокія задачы.

***— У клубе з'явіліся новыя гульцы, ці ўсе яны ўжо ўліліся ў калектыў?***

— Я чатыры гады ў «Сталіцы», склад змяняецца кожны новы сезон. Заўсёды цяжка губляць тых хлопцаў, з якімі сыграліся за год, але такі лёс у кожнага спартсмена. Усе новыя хлопцы ўжо добра ўліліся ў каманду. З'явіўся новы бразілец — Марэна, браты-украінцы. Марэна некалькі гадоў гуляў у Расіі, таму някепска размаўляе па-руску, ніякіх цяжкасцяў у яго не ўзнікла. Бразільцы, якія гулялі ў «Сталіцы» ў мінулым годзе, былі маладыя, першы раз прыехалі ў Еўропу і мелі вялікае жаданне праявіць сябе, што ў выніку і атрымалася. Марэна ўжо больш дасведчаны гулец, з пэўным узроўнем, думаю, кіраўніцтва клуба брала яго адмыслова пад Лігу чэмпіёнаў.

***— Што скажаце пра сваіх сапернікаў па групе Лігі чэмпіёнаў?***

— Пры ўсёй павазе і да сябе і да сапернікаў, улічваючы тую няпростую сітуацыю, якая склалася ў маскоўскім «Дынама» (клуб адчувае вялікія фінансавыя цяжкасці), з імі змагацца за перамогу будзе прасцей, чым з «Пескара» і «Кайратам». Гэта топавыя клубы, якія маюць у сваім складзе чэмпіёнаў свету і былых гульцоў "Барселоны", напрыклад. Супрацьстаяць ім будзе вельмі цяжка. Але гэта Ліга чэмпіёнаў, і праявіць сябе будзе старацца кожны. Думаю, пры поўных трыбунах вочы ў футбалістаў будуць гарэць, а з пляцоўкі ляцець іскры. З нашай групы далей выходзіць тры каманды, таму адна гульня можа стаць вырашальнай.

***— У тым, што Мінск і «Сталіца» справяцца з арганізацыяй сумневаў няма?***

— У гэтым я ўпэўнены. Матчы высокага ўзроўню нацыянальнай зборнай ужо праходзілі ў Мінску і водгукі мы атрымалі самыя станоўчыя. Прыязджалі партугальцы, чэхі, жылі ў цэнтры горада і былі вельмі ўражаныя. Так, мы яшчэ ніколі не прымалі Лігу чэмпіёнаў, але ведаючы колькі «Сталіца» робіць для папулярызацыі міні-футбола, як рыхтуецца да гэтага турніру, няма сумневаў у поспеху. Рэклама, розныя акцыі, прапановы па куплі квіткоў запушчаны ўжо даўно.

Хачу адзначыць, што наш клуб, ды і міні-футбол у цэлым, у краіне робіць вялікія крокі наперад. У нас з'явілася першая акадэмія міні-футбола ў краіне, добры клубны сайт, новы палац, у якім мы гуляем, прымаем удзел у прэстыжных турнірах, у нас з'явіліся першыя бразільцы ў чэмпіянаце Беларусі — усё гэта прыцягвае цікавасць. Я вярнуўся з Расіі гадоў пяць назад і застаў яшчэ тыя жудасныя халодныя залы, а цяпер паглядзіце на пляцоўкі ў Магілёве, Оршы, Гомелі. Трэба аддаць належнае і нацыянальнай зборнай, заўсёды ўдзельнічае ў плэй-оф чэмпіянатаў свету і Еўропы, вядома, бываюць няўдачы, але яны не глабальныя.

***— Тройчы вы прызнаваліся лепшым міні-футбалістам краіны, што значыць для вас гэтае званне?***

— У футзале я 20 гадоў і свае лепшыя сезоны правёў у расійскім чэмпіянаце, калі дамагаўся з клубамі максімальных вынікаў, браў медалі. Тады не быў прызнаны лепшым, хоць быў на галаву мацнейшы за сябе сённяшняга.

***— Якая перамога застанецца ў памяці назаўсёды?***

— У маладосці яны ўсе былі ярчэйшыя, чым цяпер. Першая «бронза» чэмпіяната Расіі з камандай «Газпрам-Югра» стала вельмі важнай для мяне, а ў наступным сезоне мы ўзялі сярэбраныя медалі, і гэта таксама было вельмі каштоўна. Зараз разумею, што кожнае чэмпіёнства, медаль для мяне могуць быць апошнімі, таму імкнуся шанаваць гэтыя прыемныя моманты.

***— У перыяд легіянерскай кар'еры можна вылучыць самыя паспяховыя гады?***

— Калі меркаваць па спартыўных дасягненнях, гэта безумоўна пяць сезонаў у «Газпрам-Югра». Пік кар'еры, як мне здаецца, прыпаў на сезон у «Дзіне». Тады ўсё неяк лёгка атрымлівалася, з натхненнем. Невялікі, але яркі перыяд надарыўся ў Італіі, у тыя гады быў яшчэ маладым, на ўсё глядзеў адкрыўшы рот. Чаго вартае адно толькі запрашэнне ў італьянскі клуб... Гатовы быў гуляць бясплатна. Ну і сама Італія, Неапаль, бераг мора. З гэтай краінай лёс звязаў мяне, як ні з якой іншай. Цяпер езджу туды адпачываць з сям'ёй і на аматарскія турніры па пляжным футболе. У Італіі ў мяне з'явіліся сябры, у тым ліку трэнер іх зборнай Раберта Менікелі, нядаўна ён быў у Мінску, якраз сустракаліся.



**Аляксандр Чэрнік з жонкай Вольгай і сынам Мікалаем на цырымоніі «Зорны мяч». Аляксандр атрымаў прыз за званне лепшага міні-футбаліста краіны.**

***— Якое месца ў вашай кар'еры заняла зборная Беларусі, за якую вы правялі больш за 100 матчаў?***

— Усё жыццё адыграў у зборнай, ніколі не рваў на сабе футболку, але да нацыянальнай каманды заўсёды стаўлюся з вялікай павагай. У складаныя часы прылятаў нават за свае грошы. Ніколі не адмаўляўся, хоць у Расіі ў адным клубе нават прапаноўвалі прыдумаць якую-небудзь траўму, заахвоціць фінансава, каб я не ехаў у зборную. А для мяне гэта не толькі гонар гуляць за сваю краіну, але яшчэ і магчымасць убачыцца з сябрамі, пабыць з сям'ёй. Падчас легіянерскіх гадоў зборная была для мяне аддушынай.

***— На працягу многіх гадоў і ў зборнай і ў «Сталіцы» вы капітан...***

— Дзякуй хлопцам, што выбіраюць мяне. Я добра знаходжу агульную мову з моладдзю, магу і пажартаваць, нешта абмеркаваць, яны смяюцца, называюць мяне дзядзька Саша, але я не нясу функцыю «дзядзькі». Не хаджу ў вобразе па раздзявальні, чапляючыся каронай за дзвярныя праёмы. Наадварот, заўсёды выступаю за больш дэмакратычныя адносіны ўнутры калектыву, каб усім было камфортна. Я не абламаюся, калі пайду і збяру мячы, але ў той жа час у камандзе павінна быць павага.

**У расійскай Суперлізе Аляксандр Чэрнік правёў 11 сезонаў, на працягу якіх згуляў больш за 400 матчаў. З 2012 года нападаючы выступае ў чэмпіянаце Беларусі: гуляў у «Вітэне», пасля перайшоў у «Сталіцу». На цяперашні момант Аляксандр не толькі капітан зборнай Беларусі і мінскай «Сталіцы», але і трэнер у дзіцяча-юнацкай акадэміі «Сталіца-Юні».**

**У складзе зборнай Беларусі дэбютаваў у 1996 годзе, правёў за нацыянальную каманду больш за 100 матчаў.**

***— За 20 гадоў ніколі не пашкадавалі, што перайшлі з вялікага ў міні-футбол?***

— Не, таму што лёс у міні-футболе ў мяне склаўся добра. Атрымалася згуляць за мяжой у добрых клубах, па міні-футбольных мерках нядрэнна зарабіць, здзейсніцца ў нацыянальнай зборнай. Кар'ера склалася.

***— Як лёс звязаў вас з акадэміяй міні-футбола?***

— Пераходзячы з «Вітэна» ў «Сталіцу» я выступіў з такой ініцыятывай — стварыць першую ў краіне акадэмію міні-футбола. Ніхто не мог падказаць мне што і як рабіць, таму што да гэтага нічога падобнага ў Беларусі не было, але я бачыў, як рабілі падобныя праекты ў Расіі. Таму першыя гада сам быў і дырэктарам, і галоўным трэнерам, і арганізатарам, і маркетолагам. Аб'яўляў на футболе аб наборы хлапчукоў, прасіў, каб гаварылі пра гэта на тэлебачанні.

Цяпер у нас ёсць «Сталіца-Юні», каля 200 дзяцей, у акадэміі «Аякса» іх, напрыклад, 220. Штосьці ў нас сёння атрымліваецца, штосьці не. Зараз я трэніюрую і маленькіх і больш дарослых хлопцаў, нядаўна дадалася U-16. Набіраем юніёрскую зборную з прыцэлам на падрыхтоўку да Алімпіяды. Запрашаем хлопцаў з вялікага футбола, таму што ў нас пакуль няма выпускнікоў футзальных акадэмій ці секцый такога ўзросту. Трэніроўкі абсалютна бясплатныя, праходзяць у добрай зале, у адным з лепшых спартыўных палацаў Мінска. Чакаем ахвотных!

***— Вы заўсёды хацелі стаць дзіцячым трэнерам?***

— Ніколі не хацеў і цяпер не хачу, проста імкнуся развіваць міні-футбол. А працаваць з дзецьмі ў мяне атрымліваецца, таму не магу сысці. Магчыма, мне хацелася б правесці вечар у іншай кампаніі, але ведаю, што мяне чакаюць дзеці і іду да іх на трэніроўку. Перш за ўсё ахвярую часам, які мог бы правесці з сям'ёй. Пасля завяршэння кар'еры мне хацелася б застацца ў спорце, але займацца селекцыяй або арганізацыяй збораў, больш менеджэрскай работай, чым трэнерскай. Бо, пагуляўшы ў Расіі, ведаю, як правільна будаваць структуру клуба, ёсць вопыт і замежных спецыялістаў.

***— Ведаю, што акрамя трэнерскай дзейнасці вы часта дапамагаеце дзецям...***

— Кожны раз перад Новым годам разам са «Сталіцай-Юні» праводзім калядны спарынг. Запрашаем дзяцей з дзіцячага дома і гуляем у футбол. Разам з бацькамі рыхтуем падарункі для іх, стараемся купіць менавіта тое, што яны хочуць. У нас вельмі шмат людзей з добрым сэрцам ■

■ Еўрагульні. Чакаем разам!

# ВАДА БУРЛІЦЬ АД УЗМАХАЎ ВЁСЛАЎ

## Ці гатова Заслаўе прыняць II Еўрапейскія гульні?

**Веслаславанне — адзін з самых медальных відаў спорту ў краіне, дарэчы, першыя алімпійскія чэмпіёны Беларусі — прадстаўнікі менавіта гэтага віду спорту. Цяпер у нас ім займаюцца каля пяці тысяч дзяцей. Уключэнне веславання ў праграму Еўрагульняў вялікі плюс для яго далейшага развіцця і выдатны шанц для айчынных спартсменаў заваяваць узнагароды. У 2019 годзе гэтыя спаборніцтвы будуць праходзіць на вяслярным канале ў Заслаўі. Даведаемся, якія ўмовы ён можа прапанаваць атлетам і балельшчыкам, а таксама наколькі сур'ёзны вопыт правядзення міжнародных турніраў мае сёння.**



У актыве аднаго з самых сучасных спартыўных аб'ектаў краіны ўжо сотні спаборніцкіх дзён, тысячы спартсменаў і заездаў, дзясяткі медалёў, слёзы радасці і расчаравання. Сёння тут ёсць усё для правядзення спаборніцтваў самага высокага міжнароднага ўзроўню, але пачыналася гісторыя не так яскрава.

Цэнтр быў створаны на базе Рэспубліканскай школы вышэйшага спартыўнага майстэрства па водных відах спорту, заснаванай 1 красавіка 1980 года. Гадам адкрыцця канала Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па вяслярных відах спорту лічыцца 2006-ы, але, каб набыць выгляд, які ён мае сёння, трэба было выканаць вялікую работу. У першую чаргу, гэта датычылася будаўніцтва інжынернай і транспартнай інфраструктуры, у 2008 годзе ў Заслаўі была уведзена ў эксплуатацыю гідратэхнічная частка аб'екта, а ў верасні 2009-га пабудаваны лабараторны корпус і трансфарматарная падстанцыя.

Вядома, арганізацыя паўнавартаснага трэніровачнага працэсу і тым больш правядзенне топ-турніраў немагчыма без адміністрацыйна-бытавога корпуса. Сёння ў Заслаўі ён уключае сталовую, інтэрнат, тры трэнажорныя залы (зала сілавой падрыхтоўкі, вяслярны басейн, зала спецыяльнай падрыхтоўкі), элінгі для захоўвання лодак і медыка-аднаўленчы цэнтр з двума лазневымі комплексамі.

Напэўна аматары спорту, якія сачылі за падрыхтоўкай Бразіліі да Алімпійскіх гульняў, памятаюць, колькі нараканняў выклікаў вяслярны канал у Рыа. Усё з-за таго, што спартсмены скардзіліся на яго забруджанасць. Дык вось, падчас праектавання канала ў Заслаўі, нашы спецыялісты ўлічылі не толькі добра вядомую вяслярам ружу вятроў, якая здольна ўплываць на часавыя паказчыкі спартсменаў, але і прыдумалі, як змагацца з расліннасцю, якая «атакуе» ў цёплую пару года і перашкаджае атлетам. Поруч з рознымі метадамі барацьбы з падводнай флорай у ваду было запушчана 600 кг карпа і таўсталобіка.

У 2011 годзе, ужо пасля рэканструкцыі, цэнтр быў здадзены ў эксплуатацыю як спартыўны аб'ект рэспубліканскага прызначэння, а праз год стаў месцам правядзення чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў па акадэмічным веславанні. І ўжо тады цэнтр атрымаў першую высокую ацэнку ад міжнародных спецыялістаў. *«У Заслаўі для спартсменаў створаны ўмовы, якія неабходныя, каб паказаць высокі вынік. Да таго ж, паказаць вынік у справядлівых умовах. Я лічу, гэта ідэальнае месца»,* — пракаментавала **суддзя з Расіі Людміла САРАЕВА.**

— *У 2014 годзе мы правялі чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ сярод студэнтаў. Колькасць удзельнікаў турніраў з кожным разам значна павялічвалася,* — расказвае **Сяргей ХМЯЛЬКОЎ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па вяслярных відах спорту.** — *Мы спрабавалі сілы, набіралі каманды, здольныя арганізоўваць міжнародныя спаборніцтвы. Значны час пайшоў на тое, каб правесці поўную падрыхтоўку. Да 2016 года з'явіўся новы мост, пабудаваны для таго, каб скарацiць шлях гледачоў да месца спаборніцтваў. Бо раней патрабавалася 3,5—4 кіламетры пешай прагулкі, каб дабрацца да трыбун.*



**Лічбы**

**За 10 гадоў навучэнцамі і выхаванцамі ўстановы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па вяслярных відах спорту» на чэмпіянатах, Кубках і першынствах свету і Еўропы заваявана 275 медалёў, з якіх 103 залатых, 105 сярэбраных і 67 бронзавых.**

У жніўні 2016-га Заслаўе прыняло чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ сярод юніёраў і моладзі. Гэты турнір стаў адным з самых буйных па колькасці ўдзельнікаў — больш за тысячу весляроў з 62 краін. Тады канал атрымаў высокую ацэнку ад старшыні тэхнічнай камісіі чэмпіянату Ёнса Каля.

Большасць аб'ектаў, якія прымаюць буйныя турніры, як правіла, размешчаны на рэках і азёрах, не так шмат каналаў пабудавана адмыслова. Акрамя нашага, гэта каналы ў Крылацкім (Масква), канал у Дуйсбургу (Германія) і некаторыя іншыя, але тое не азначае, што яны менш зручныя для спартсменаў. Пра гэта сведчаць меркаванні весляроў, якія спаборнічалі ў Заслаўі. *«У Беларусі вельмі зручны вяслярны канал. Напрыклад, на канале ў Партугаліі справа дзьме вецер, на турнірах ў Канадзе наогул была рака, а не канал, а ў Венгрыі на фінішы стаяць шчыты: хто ідзе каля іх, выходзіць у лідары, таму што іх выдзімае, як у трубу»,* — параўнаў месцы спаборніцтваў казахстанскі вясляр Цімафей Емяльянаў.

А вось удзельнік чэмпіянату свету 2016 года з Расіі Андрэй Шмыроў расказаў пра тое, што спаборнічаць у Заслаўі досыць цяжка: *«Мне здаецца, канал пабудаваны ў занадта адкрытым месцы, таму вецер стварае дадатковыя перашкоды. Зрэшты, гэта проста праверка на трываласць, характар, волю. Спаборніцтвы паказваюць, хто гатовы з гэтым змагацца».*

Сёння даўжыня вяслярнага канала ў Заслаўі складае 2150 м, шырыня — 130 м, а глыбіня — 3—3,5 м. Ён абсталяваны домікамі прамежкавага хронаметражу і назіральнымі пастамі. Фінішная трыбуна ў Заслаўі мае 152 месцы для гледачоў, а прамежкавая — 480, для зручнасці спартсменаў і балельшчыкаў там устаноўлена самае вялікае святлодыёднае табло ў Беларусі — 66 кв. м.

Дабрацца да вяслярнага канала з Мінска не складана, даехаць можна на электрычцы і маршрутным таксі. Да паслуг гасцей, якія прыбываюць на аўтамабілях, маецца бясплатная паркавачная зона ■



## З'явіўся Бульбазаўр і Бэтмен

### Працягваецца конкурс на распрацоўку талісмана II Еўрапейскіх гульняў

**Прыняць удзел у ім можа любы ахвотны, і трэба сказаць, многія зацікаўленыя ўжо паспелі скарыстацца гэтай магчымасцю. Міністэрства інфармацыі, якое займаецца прыёмам конкурсных работ, ужо назапашвае ідэі беларусаў. Сярод іх прапановы зрабіць талісманам будучых Еўрагульняў бусла, васілёк і нават трактар. З'явіліся і дзіўныя персанажы, напрыклад Бульбазаўр ці Бэтмен.**

Нагадаем, што талісман павінен адпавядаць агульнай канцэпцыі Еўрапейскіх гульняў, быць лёгкім і зразумелым балельшчыкам і гледачам, выклікаць станоўчыя асацыяцыі і адпавядаць слогану «Bright Year, Bright you» («Час яскравых перамог»). Узор талісмана павінен быць прадстаўлены ў электроннай форме ў выглядзе каляровага малюнка, выкананага ў любой тэхніцы (уключаючы камп'ютарную графіку). Малюнак талісмана неабходна суправадзіць кароткай тлумачальнай запіскай, якая раскрые творчыя ідэі аўтара, а таксама змесціць прапановы ў дачыненні да імя (наймення) талісмана.

У Міністэрстве інфармацыі адзначылі, што некаторыя ўдзельнікі забываюць пра тое, што талісман павінен быць вытрыманы ў адным стылі з лагатыпам Еўрагульняў, на якім намалявана папараць-кветка, і быць звязаным з купальскай ноччу. Сярод паўсотні работ сустракаюцца цікавыя малюнкі без заявак, таму арганізатары заклікаюць больш уважліва ставіцца да ўмоў конкурсу. У працэс пачалі ўключацца і прафесіяналы, свой інтарэс да конкурсу праявілі ўжо некалькі дызайнераў, а наогул, пераважная большасць заявак прыходзіць ад дарослых і толькі некалькі ўдзельнікаў — гэта дзеці.

Конкурс завершыцца 15 лістапада, яго вынікі будуць абвешчаны ў снежні. Уладальнікі першых трох прызавых месцаў атрымаюць запрашальныя білеты на мерапрыемствы II Еўрапейскіх гульняў, а таксама камплекты парадна-спартыўнай экіпіроўкі беларускай зборнай.

■ Пхёнчхан-2018

## Арганізатары зімовай Алімпіяды прадставілі медалі



**У аснову дызайну ўзнагарод, якія будуць уручацца прызёрам Гульняў у Карэі, ляглі матывы нацыянальнай культуры прымаючай краіны. Паверхня кожнага медаля мае цыліндрычныя дыяганальныя лініі, якія, паводле задумы арганізатараў, сімвалізуюць гісторыю Алімпійскіх гульняў і імкненне ўдзельнікаў да перамогі. Стужкі медалёў выкананы з выкарыстаннем традыцыйных для Карэі тканін і маюць надпісы, выкананыя шрыфтам хангыль.**

Кожная ўзнагарода захоўваецца ў спецыяльным драўляным футляры, дызайн якога натхнёны карэйскай архітэктурай і сімвалізуе мноства драўляных пабудоў у краіне.

Нагадаем, Алімпійскія гульні ў Пхёнчхане пройдуць з 9 па 25 лютага 2018 года. На іх будзе прадстаўлена сем відаў спорту, якія ўключаюць у сябе 15 зімовых спартыўных дысцыплін: тры каньковых (фігурнае катанне, канькабежны спорт і шорт-трэк), шэсць лыжных (гарналыжны спорт, лыжны спорт, фрыстайл, лыжнае дваябор'е, скачкі з трампліна і сноўборд), два бабслейныя: (бабслей і скелетон), а таксама чатыры іншыя віды спорту: біятлон, кёрлінг, хакей і санны спорт.

## Аўстрыя можа прыняць зімовыя Алімпійскія гульні 2026 года

**Па ініцыятыве ўладаў 15 кастрычніка жыхары аўстрыйскай федэральнай зямлі Ціроль прымуць удзел у галасаванні аб вылучэнні кандыдатуры горада Інсбрука на правядзенне зімовай Алімпіяды ў 2026 годзе.**

Генеральны сакратар НАК Аўстрыі Петэр Менэль упэўнены, што зімовая Алімпіяда павінна праводзіцца ў традыцыйных, правераных часам і неаднаразова апрабаваных спартыўных лакацыях. Ён таксама выказаў меркаванне, што «Ціроль створаны для таго, каб стаць сталіцай сучасных і экалагічна бяспечных Гульняў у 2026 годзе».

## МАК дапаможа краінам Карыбскага архіпелага



**Міжнародны алімпійскі камітэт прыняў рашэнне аб заснаванні рэзервовага фонду з капіталам $1 млн для аказання дапамогі нацыянальным алімпійскім камітэтам краін Карыбскага басейна, якія пацярпелі ад найбуйнейшага ўрагану «Ірма», што абрынуўся на заходнюю частку Атлантыкі.**

— *Усе нашы думкі з ахвярамі ўрагану і іх сем'ямі, якія засталіся без прытулку з прычыны стыхійнага бедства,* — выказаў спачуванні пацярпелым **Прэзідэнт МАК Томас БАХ.** — *Мы зробім усё, што ад нас залежыць, каб дапамагчы аднавіць разбураную інфраструктуру.*

Заснавальнікамі фонду дапамогі карыбскім НАК выступілі Міжнародны алімпійскі камітэт, фонд «Алімпійская салідарнасць» і Панамерыканская спартыўная арганізацыя ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
15.09.2017 г.
Сушко С. А.

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным советом
Закрытого акционерного
общества «Универсам
«Центральный»
8 сентября 2017 г. №9

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии облигаций третьего
выпуска Закрытого акционерного
общества «Универсам «Центральный»,
утвержденный Наблюдательным
советом Закрытого акционерного
общества «Универсам «Центральный»
09.03.2017 №2

Пункт 1.6 изложить в следующей редакции:

«1.6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента

Депозитарием Эмитента является депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»:

зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, номер государственной регистрации – 056, код депозитария – 005;

местонахождение: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18;

действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1089 сроком действия – бессрочно».

| | |
|---|---|
| Директор Закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный» | А. А. Застенский |
| Директор Общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» | Т. Г. Бойкова |
| Исполняющий обязанности директора Унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» | М. Л. Максимович |

УНП 100060965

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
15.09.2017 г.
Сушко С. А.

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным советом
Закрытого акционерного
общества «Универсам
«Центральный»
8 сентября 2017 г. №9

ИЗМЕНЕНИЯ
в Решение о третьем выпуске
облигаций Закрытого акционерного
общества «Универсам «Центральный»,
утвержденное Наблюдательным
советом Закрытого акционерного
общества «Универсам «Центральный»
09.03.2017 №2

Пункт 4 изложить в следующей редакции:

«4. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента

Депозитарием Эмитента является депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»:

зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, номер государственной регистрации – 056, код депозитария – 005;

местонахождение: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18;

действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089 сроком действия – бессрочно».

| | |
|---|---|
| Директор Закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный» | А. А. Застенский |
| Директор Общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» | Т. Г. Бойкова |
| Исполняющий обязанности директора Унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» | М. Л. Максимович |

УНП 100060965

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Кривичское РТП», Минская область, Мядельский р-н, г. п. Кривичи, ул. К. Маркса, 10 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание магазина** | Здание специализированное розничной торговли | 164,9 кв. м | 633/С-13690 | Минская обл., Мядельский р-н, Кривичский с/с, д. Парубки, пер. Первомайский, 1А |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | **Блочная пристройка, кирпичная пристройка, блочный сарай** |

**Сведения о земельном участке**: предоставлен Продавцу пл. 0,1166 га на праве аренды сроком по 23.01.2113 г. для обслуживания здания магазина. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0077 га/

**Начальная цена с НДС 20% – 25 000.00 бел. руб.**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **31.10.2017 г.** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **30.10.2017 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА, ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор аукциона – Лельчицкий районный исполнительный комитет.

**Лот №1** Предмет аукциона – право заключения договора аренды на земельный участок, площадью 0,0273 га с кадастровым номером 322855100001001499, расположенный по адресу: Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Красноармейская. Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (в охранной зоне линий связи и радиофикации, сетей и сооружений теплоснабжения).

Целевое назначение использования земельного участка – для строительства и обслуживания магазина промышленной группы товаров (земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Срок аренды земельного участка – 25 (двадцать пять) лет.

Начальная цена продажи – 1213,23 (одна тысяча двести тринадцать рублей двадцать три копейки);

Сумма задатка – 121,32 (сто двадцать один рубль тридцать две копейки);

Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названой аукционистом.

Условия продажи:

внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

заключение победителем аукциона с Лельчицким районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;

разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;

освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;

осуществления строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Лот №2** Предмет аукциона – частная собственность на земельные участки из них:

площадью 0,1102 га с кадастровым номером 322855100002002395, расположенный по адресу: Гомельская область, г. п. Лельчицы ул. Советская;

площадью 0,1198 га с кадастровым номером 322855100002002396, расположенный по адресу: Гомельская область, г. п. Лельчицы ул. Белорусская.

Целевое назначение использования земельных участков – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

**Начальная цена продажи**:

участок 3 г. п. Лельчицы ул. Советская – 5524,05 (пять тысяч пятьсот двадцать четыре рубля пять копеек);

участок 4 г. п. Лельчицы ул. Белорусская – 6005,27 ( шесть тысяч пять рублей двадцать семь копеек);

**Сумма задатка:**

участок 3 г. п. Лельчицы ул. Советская – в сумме 552,40 (пятьсот пятьдесят два рубля сорок копеек);

участок 4 г. п. Лельчицы ул. Белорусская – 600,53 (шестьсот рублей пятьдесят три копейки).

Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названой аукционистом.

**Условия продажи:**

внесение победителем аукциона платы за частную собственность земельных участков;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;

разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;

освоение земельного участка в срок до одного года после разработки и утверждения проектно-сметной документации;

осуществления строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

**Арендодатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет, контактные телефоны в г. п. Лельчицы: 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33.**

**1.** Аукцион состоится **1 ноября 2017 г. в 10.00** в здании Лельчицкого районного исполнительного комитета каб. 209 по адресу: г. п. Лельчицы, ул. Советская 42.

**2.** Для участия в аукционе приглашаются лица подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона:

по лоту №1 – индивидуальные предприниматели и юридические лица;

по лоту №2 – физические лица, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в землеустроительную службу райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить по результатам аукциона.

К заявлению необходимо приложить:

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка;

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия личного паспорта;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

***3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 27 октября 2017 года по адресу: г. п. Лельчицы, ул. Советская 42. Заключительная регистрация участников 1 ноября 2017 г. с 9.00 до 9.45.***

4. ***Сумма задатка перечисляется на счет №BY89AKBB36414210000353000000, в ЦБУ №315 г. п. Лельчицы филиала №300 ГУО ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, БИК AKBBBY21300, УНП 400032854, получатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет.***

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона.

За дополнительной информацией обращаться Лельчицкий районный исполнительный комитет (землеустроительная служба), контактные телефоны в г. п. Лельчицы – 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703 |
| **Продавец** | Филиал «Гродненское зверохозяйство» торгового унитарного предприятия «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», Гродненский район, Озерский с/с, 4 в районе д. Стриевка |

**Предмет аукциона**
**(имущество реализуется одним лотом)**
**Месторасположение: Гродненская обл., Гродненский р-н, Озерский с/с, аг. Озеры**

| Наименование (назначение) | Общая площадь кв. м | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Одноэтажное кирпичное здание цеха съемки и выделки шкурки: кормокухня** | 2020,6 | 401/С-11427 |
| **Двухэтажное кирпичное здание котельной** | 411,1 | 401/С-11387 |
| **Одноэтажное кирпичное здание ветеринарного пункта** | 102,4 | 401/С-11288 |
| **Одноэтажное здание магазина** (здание специализированное розничной торговли) | 90,1 | 401/С-11451 |
| **Холодильник** (здание специализированное иного назначения) | 2391,3 | 401/С-11450 |
| **Холодильник (475 т.)** | 1004,7 | 401/С-14044 |
| **Пилорама** (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) | 845,8 | 401/С-11408 |
| **Гараж** (здание специализированное транспорта | 444,2 | 401/С-12087 |
| **Бригадный домик бригады 1-4, бригады 2-5** | 160,6 | 401/С-11372 |
| **Бригадный домик №3** | 29,2 | 401/С-11371 |
| **Бригадный домик №1 бригады №6** | 23,4 | 401/С-11368 |
| **Домик главного зоотехника** (здание специализированное иного назначения) | 26,5 | 401/С-11411 |
| **Буфет-диспетчерская** | 162,2 | 401/С-14568 |
| **Склад-ангар №1** | 509,4 | 401/С-11410 |
| **Склад-ангар №2** | 506,3 | 401/С-11390 |
| **Напольный склад №1** | 65,0 | 401/С-11407 |
| **Напольный склад №2** | 65,0 | 401/С-11409 |
| **Склад материальный** | 1018,2 | 401/С-27607 |
| **Весовая** (здание неустановленного назначения) | 34,7 | 401/С-12168 |
| **Насосная** (здание специализированное коммунального хозяйства) | 31,2 | 401/С-12169 |
| **Подстанция** | 30,1 | 401/С-12170 |
| **Трансформаторная подстанция** | 50,9 | 401/С-13647 |
| **Административный корпус** | 328,8 | 401/С-27608 |

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды пл. **25,8318** га для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений (срок действия – по 23.11.2065)

**Начальная цена с НДС 20% – 826 080,00 бел. руб**

**Реквизиты для перечисления задатка:** Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется в белорусских рублях на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **31.10.2017 г.** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **30.10.2017 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, ком. 201. Извещение о выкупе ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (далее по тексту – общество) акций общества по требованию акционеров общества

В связи с принятием Общим собранием акционеров общества решения от 18.09.2017, протокол №39, о совершении крупной сделки (поручительство за дочернее предприятие ООО «АМКОДОР-Маш» в обеспечение исполнения обязательств по погашению и обслуживанию внешнего займа), акционеры общества, которые голосовали против принятия решения о совершении крупной сделки или не были надлежащим образом извещены о проведении общего собрания акционеров, на котором было принято решение о совершении крупной сделки, имеют право требовать у общества выкупа принадлежащих им акций общества. Общее собрание акционеров общества от 18.09.2017, протокол №39, утвердило цену выкупа обществом акций общества по требованию его акционеров в размере 5 (пять) белорусских рублей за одну акцию.

Заявление акционера с требованием о выкупе обществом принадлежащих акционеру акций общества подается в общество путем направления заказным письмом с уведомлением о вручении или вручения под роспись уполномоченному принимать корреспонденцию лицу по адресу: 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, ком. 201, и должно поступить в общество не позднее 30 октября 2017 года.

Заявление должно содержать:

заголовок: «Заявление с требованием о выкупе акций ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»;

– фамилию, имя, отчество; место жительства; вид и данные документа, удостоверяющего личность; личную подпись (если акционером является физическое лицо);

– наименование (полное и краткое); местонахождение; регистрационный номер и дату государственной регистрации, наименование регистрирующего органа; учетный номер плательщика; личную подпись руководителя юридического лица, заверенную оттиском печати (если акционером является юридическое лицо);

– количество акций, выкупа которых требует акционер;

– банковский счет, на который должны быть перечислены денежные средства в случае выкупа акций;

– доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства, если интересы акционера представляет другое уполномоченное лицо.

Выкуп акций осуществляется обществом в течение 365 дней после истечения срока предъявления акционерами заявлений.

Справки по тел. 308-33-42.

УНП 100135676




## У ПОШУКАХ СЯБЕ

Максім (а цяпер, вядома ж, Максім Іванавіч) звальняўся з войска ў пачатку 50-х гадоў. Дома з нецярпеннем яго чакалі маці і тры малодшыя сястры.

Зрэшты, слова «дом» тут не вельмі дарэчы, бо якраз яго ў сям'і і не было: немцы спалілі хату, яны ж, па даносе паліцаяў, забілі бацьку, даваеннага старшыню сельскага Савета...

Значыць, яму, Максіму, пасля службы трэ было запрагацца: будавацца, клапаціцца пра сваіх. Маці і сёстры — ён дакладна ведаў — спадзяваліся на яго мужчынскія рукі, розум, на ягоныя... грошы.

Паўстала пытанне, дзе ж іх зарабляць?

На сямейным савеце дружна пастанавілі, што працаваць — найлепш у міліцыі. Гэта, маўляў, і прэстыжна, і выгадна...

«Можна паспрабаваць...» — пагадзіўся са сваімі Максім і пайшоў уладкоўвацца ў сваё ж раённае аддзяленне міліцыі.

Там былому браваму салдату ўзрадаваліся, аформілі на работу, выдалі новенькую форму, зброю. Там і ў той жа дзень ён, разам з калегамі, атрымаў сваё першае заданне: сачыць за парадкам на святочным кірмашы і, калі пашчасціць, затрымаць (лепей на гарачым) вядомую гандлярку самагонам.

І вось ходзяць міліцыянеры па рынку, назіраюць за ўсімі і ўсім... Бачаць, з-за прадуктовай крамы адзін мужык, нібы злодзей, выходзіць — азіраецца па баках, потым другі... Міліцыянеры — туды. І не марна! Там іх няўлоўная прыгажуня! Гандлюе гарэлачкай... І на шчасце — не ўсю яшчэ прадала: засталіся ў кашы бутэлькі-ўлікі...

Карацей, затрымалі жанчыну — Максіму, як новаму супрацоўніку, даручылі, што называецца, даставіць яе ў аддзяленне міліцыі. Той, вядома ж, пад казырок: «Ёсць!» і пачынае «весці». Гэта значыць, што прыгажуня першай ідзе, а «канваір» (трэба сказаць, чалавек ад прыроды ну вельмі тактоўны і сарамлівы ) следам крочыць, прычым з такім выглядам, быццам не мае да гэтай жанчыны ніякага дачынення.

Такім чынам выходзяць яны за вароты кірмашу, ідуць па вуліцы. Недзе там, наперадзе (дзе дакладна, Максім толкам яшчэ не запомніў), аддзяленне міліцыі. А да яго была... хата самагоншчыцы. Таму жанчына дайшла да яе і... спрытна юркнула за свае варотцы, за дзверы.

— Бывай, служывенькі! — пракрычала адтуль. — Дзякуй за кампанію! Заходзь у госці, але не зараз... Зараз — выбачай!

Перад носам у хлапца загрымела засаўка.

Стукаць у дзверы сэнсу не мела. А таму Максім (што было рабіць?) трохі патаптаўся на ганку, пастаяў каля брамкі, потым, з ног да галавы вінаваты, адзін — без злачынцы — пасунуўся ў аддзяленне міліцыі.

Да яго недалёка было, але ж хлопец усё абдумаў: прыйшоў, здаў атрыманую раніцай зброю і міліцэйскую форму ды пехатой пашыбаваў у родную вёску.

Шчыра, як на духу, пра ўсё расказаў матулі. Павінціўся яшчэ:

— Прабач, не мая гэта справа!

— Разумею, сынок, — уздыхнула тая. — Не бойся, знойдзем і тваю, вось убачыш!

Праўду яна сказала. Максім стаў цудоўным кавалём! І хату тады яны збудавалі. Нават не адну.

**Дзіна Дубадзелава,**
*в. Леніна, Добрушскі раён.*

## ВАЙНА ВАЙНОЙ...

У той год, амаль як сёлета, і лісічкі, і маслякі, і рыжыкі-апенькі, і падасінавікі з баравікамі з'явіліся разам. Не выпадала людзям па хатах сядзець — усе ў лес пацягнуліся. Я, напрыклад, па некалькі рэйсаў рабіў: першы, вядома ж, зранку, другі — па абедзе...

У адзін з такіх вось паходаў і сустрэў свайго былога аднавяскоўца Міхася. Прыселі з ім на пянёках, пра тое-сёе пагаманілі: пра сем'і, дзяцей, жыццё... І ў мяне, і ў Міхала яно, дзякаваць богу, нядрэнна склалася: усяго хапала, апроч, можа, здароўя ды грошай... Не тое, што некалі.

Узгадалі мы з ім гады перабудовы: інфляцыю, пустыя паліцы ў крамах, той жах, калі нават за грошы нічога не можаш купіць...

І тут прыпомніў мой сябар адну ці то сумную, ці то смешную гісторыю.

— Памерла маці, — расказваў ён. — Гора, вядома ж, але плакаць няма калі: трэба збіраць яе ў апошнюю дарогу, трэба як след праводзіць, справіць памінкі. Народу на іх тады вельмі шмат збіралася — за голыя сталы не пасадзіш. Ды і плётак лішніх не хочацца. Маўляў, дрэнныя дзеці, не па-людску правялі... А дзе што браць, каб па-людску?

Карацей, мая жонка кажа: «Ідзі, Міша, у кантору да дырэктара саўгаса. Можа, ён чым дапаможа? Маці ж на гэтай зямлі ўсё жыццё прапрацавала». «І сапраўды», — згадзіўся я і пайшоў на паклон.

Дырэктар, праўда, чалавекам аказаўся: без лішніх слоў усё зразумеў, распарадзіўся, каб нам выпісалі свініны.

А вось загадчык свінафермы ўжо стаў «муціць»: маўляў, тое свінчо няма каму закалоць... Ды і газу ў балоне на самым донцы — не хопіць, каб абсмаліць... Ну і гэтак далей.

Але мне адступаць няма куды: людзей я сваіх прывёз (балазе дарослыя ўнукі на развітанне з бабуляй прыехалі), газ таксама «знайшоў» — у тога ж загадчыка фермы пасля тонкага намёку на барыш...

Такім чынам працэс «забойства вепрука» быў запушчаны, і я ў гэты час мог смела паехаць па іншых справах.

Уладзіўшы іх, вярнуўся на ферму, каб забраць там хлопцаў і мяса. Знаёмы ўжо загадчык выпісаў квіток на аплату, павёў мяне да забойнай пляцоўкі.

— Як не шанцуе, дык не шанцуе, — паскардзіўся па дарозе, — сёння двух парсюкоў закалолі. Толькі разабралі вашага, як на табе — скалечыўся другі — у транспарцёр нагу ўсадзіў. Прыйшлося і яго дарэзаць... Галоўнае, ладны такі парсюк.

— А як яго на транспарцёр занесла? — спытаў я потым у хлопцаў.

— На які такі транспарцёр? — не зразумелі яны.

— Ды, мусіць, на звычайны? Загадчык фермы гаварыў, што скалечылася жывёліна...

— Ды каб ён сам так скалечыўся! — грымнулі смехам хлопцы. — Мы за тым вепруком па ўсёй загарадзі ганяліся — ледзьве злавілі.

Набліжаўся Вялікдзень...

**Мікалай Юруць,**
*г. Ляхавічы.*

## ГАСПАДАРКУ ВЕСЦІ — НЕ ШТАНАМІ ТРЭСЦІ

Гэта здарылася ўвосень у невялікай вёсачцы. Яна (яшчэ з аднаасобнікаў) тады ва ўсю шчыравала: бульбу выбірала якраз, на полі. Баразны разганяла конямі. І трэба ж — у аднаго аратага торкнуўся нарог у нейкі нябачны камень, конік напяўся, а ворчык — пстрык і... папалам!

Замітусіўся гаспадар, подбегам кінуўся на суседскія палеткі, пытае, ці не пазычыць хто гэтага «прыстасавання»? Але ж дзе там — у кожнага свае градкі, своя талака. Як тут некага выручаць? Хіба старым, запасным?

— У мяне такі быў, здаецца, — пачухаў «рэпу» адзін з суседзяў. — Зганяй, брат, у вёску, паглядзі на падворку: далібог недзе ляжыць: можа, каля лазні, можа, пад паветкай... Я летам бачыў.

Пачапаў гаспадар у вёску, на чужой сялібе абышоў, агледзеў усе пабудовы. Той ворчык — не іголка, як быццам, не ў стозе, а нідзе не відаць...

Тым часам паўз бульбяное поле праязджала нейкая фурманка, спынілася ля жанчын, што сядзелі без працы, фурман спытаў, з якой прычыны прастой?

— Ды ворчык зламаўся, — скардзіцца тыя. — Гаспадар пайшоў пазычаць...

Пачуўшы гэта, мужчына ўзяў з воза сякеру, высек паблізу ладную лазіну, на нейкім метры яе зрабіў засечкі, каб пастронкі не саслізнулі, кавалкам дроту прывязаў да плуга.

Каб упэўніцца, што вось гэтая новая «канструкцыя» будзе працаваць, заставалася хіба... разараць некалькі градак бульбы. Фурман лёгка гэта зрабіў: удзячныя жанчыны тут жа пасталі ў барозны...

Што ў гэты час рабіў «гаспадар»? Ды ён усё гойсаў па вёсцы — шукаў у некага ворчык.

Калі нарэшце знайшоў і з ім, шчаслівы, вярнуўся ў поле, жонка (работа была амаль што завершана) не вытрымала: падышла да «героя», вырвала з-пад пахі ў яго тую прыладу і агрэла небаракy ніжэй спіны... Ну, вядома ж, не моўчкі: шмат што сказала. Адзін выраз вяскоўцы дагэтуль помняць: у прыватнасці, усіх хлапцоў, якія мецяць у гаспадары, яны па-ранейшаму дзеляць на тых, хто «будзе паўдня ворчык шукаць!», альбо не будзе...

**Іван Сіманёнак,**
*г. Паставы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Прыемная навіна

# ДЛЯ ШЧАСЛІВАГА ДЗІЦЯЧАГА СМЕХУ

**Сапраўдны падарунак да Дня машынабудаўніка зрабілі ўлады Жодзіна для гараджан. На вуліцы Савецкай адкрыты дзіцячы сад на 160 месцаў. Пад дашкольную ўстанову перапрафілявалі будынак былога дзіцячага дома. Навучальны працэс тут будуць весці 18 педагогаў.**

У дзіцячай установе ёсць усё неабходнае для таго, каб малыя атрымлівалі добрыя веды, развіваліся маральна і фізічна.

На двух паверхах размясціліся пакоі для дзевяці груп, музычальная, фізкультурная залы, медыцынскі кабінет, кабінеты дэфектолага, псіхолага, жывыя куткі. На базе дзіцячага садка адкрыюць другі ў Мінскай вобласці рэсурсны цэнтр прафесійнай адукацыі педагогаў.

Фінансаванне работ вялося за кошт гарадскога бюджэту.

Праз месяц у горадзе плануецца адкрыць яшчэ адзін новы садок на 250 месцаў. Тут дзеці змогуць займацца плаваннем, гімнастыкай, у гульнявой форме авалодваць IT-тэхналогіямі, асвойваць мадэляванне і графіку на мультыбордзе. Гэта дапаможа ім дасканала падрыхтавацца да школы.

Гэта будзе ўжо чатырнаццатая дашкольная ўстанова ў Жодзіне. Такім чынам мясцовыя ўлады вырашаюць пытанні крокавай даступнасці дашкольнай адукацыі ў новых мікрараёнах.

Дзень машынабудаўніка ў Жодзіне адзначыўся і іншымі важнымі падзеямі. Для гараджан адкрылі новую зону адпачынку на праспекце Міра. ААТ «БелАЗ» — упраўляючая кампанія холдынга «БелАЗ-холдынг» правяла дзень адкрытых дзвярэй. На прадпрыемства змаглі трапіць усе ахвотныя. Наведвальнікаў азнаёмілі з кар'ернай тэхнікай, якую тут выпускаюць. Яны сфатаграфаваліся на фоне волатаў-самазвалаў, набылі сувеніры. Ветэранам прадпрыемства ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі нагрудныя знакі ў гонар іх працоўных заслуг. Ушанавалі і найлепшых работнікаў прадпрыемства.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by* ■

# ПЕРШАЯ ВОСЕНЬ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Чатырохмесячная мінчанка Вольга ЕФІМЧЫК.

## Што цікавага прапануе радыё «Сталіца»?

**Традыцыйна восень лічыцца на радыё і ТБ пачаткам новага сезона. І, як правіла, ён суправаджаецца абнаўленнем сеткі вяшчання. Не стане выключэннем і радыё «Сталіца», якое ў новы сезон уступіла маштабным беларускамоўным рок-канцэртам.**

— У нашым эфіры з'явіцца праграма «Манускрыпт», — кажа **загадчык аддзела музычных праграм Таццяна ШЫШЛО.** — Весці яе будзе гісторык Лявон Казакоў. Цыкл перадач будзе прысвечаны цікавым старонкам з мінуўшчыны Беларусі, якія, пэўна, не так шырока вядомыя. Таксама з кастрычніка мы запускаем новы праект «Пракацімся без візы». Гэта будзе своеасаблівы зборнік цікавінак, якія дапамогуць паездзіць па Беларусі нядорага і незабыўна. Справа ў тым, што па-за межамі масавых экскурсій застаюцца многія месцы краіны, пра якія мала хто ведае. Акрамя таго, на нашых хвалях загучыць серыя перадач «Мінская брукаванка». Яны будуць уяўляць сабой радыёпадарожжы па сталіцы з яе знакамітымі жыхарамі і гасцямі, якія будуць расказваць, з якімі падзеямі ў іх звязаны вуліцы і дамы вялікага горада.

Працягнуць гучаць у эфіры «Сталіцы» і хіт-парады рок-музыкі, як замежнай, так і беларускай. Гэта выдатны шанц заявіць аб сабе тым маладым гуртам, якія па розных прычынах не раскручаны, але вартыя падтрымкі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Не вучобай адзінай

# АРЭНА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

**З 25 па 29 верасня ў Міжнародным універсітэце «МІТСО» абдудзецца XII Міжнародная юрыдычная алімпіяда «Моладзь за мір». Удзел у ёй возьмуць каманды з сямі краін: Вялікабрытаніі, Арменіі, Малдовы, Украіны, Казахстана, Расіі і Беларусі.**

Спаборнічаць у веданні міжнароднага права будуць студэнты-юрысты з вядучых ВНУ, сярод якіх Расійска-армянскі (славянскі) універсітэт (г. Ерэван), Універсітэт БРР (г. Лондан), Дзяржаўны інстытут міжнародных адносін Малдовы (г. Кішынёў), Нацыянальны даследчы ўніверсітэт «Вышэйшая школа эканомікі» (г. Масква), Нацыянальны ўніверсітэт «Адэская юрыдычная акадэмія».

Міжнародная юрыдычная алімпіяда «Моладзь за мір» — унікальны праект, які не мае аналагаў ва Усходняй Еўропе і СНД. Яна ўваходзіць у тройку самых прэстыжных еўрапейскіх конкурсаў па міжнародным праве. Штогод у якасці членаў журы ў спаборніцтвах удзельнічаюць замежныя эксперты па міжнародным праве.

Арганізатар праекта — Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО» пры падтрымцы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Адзін з інфармацыйных спонсараў алімпіяды — Выдавецкі дом "Звязда".

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by* ■

■ Гутарка з краязнаўцам

# «НАШ ДУХ ЛУНАЦІ ВЕЧНА БУДЗЕ»

## Нечаканыя думкі пра Янку Купалу

**Краязнавец, літаратуразнавец, бібліяфіл з Маладзечна Міхась КАЗЛОЎСКІ творы свайго земляка — Янкі Купалы — можа чытаць на памяць некалькі гадзін... І ў любы зручны момант дзеліцца з прысутнымі сваімі даследаваннямі пра песняра. Можа, гэта і ёсць сапраўдная любоў да класіка — прапушчаная праз сваё сэрца: калі адчуваецца і боль, і радасць таго, хто тварыў амаль стагоддзе таму. Краязнавец выказаў цікавую думку, што Купала — геніяльны паэт, але яго вялікая трагедыя ў тым, што ён не прачытаны... Тое ж меркаванне (што не ведаем мы належным чынам твораў свайго песняра) рэфрэнам гучала і на паэтычным пленэры памяці Таццяны Сапач у Маркаве. Менавіта там удалося запісаць некалькі арыгінальных і нечаканых тэзісаў Міхася Казлоўскага пра Янку Купалу.**



### Вацлаў Ластоўскі на авансцэне

«Асабіста для мяне самы нецікавы перыяд творчасці Янкі Купалы — 1906—1910 гады, калі выходзілі яго зборнікі «Жалейка» і «Гусляр», — заўважае Казлоўскі. — Бо Купала, як і большасць беларускіх пісьменнікаў, арыентаваўся тады на сялянскую тэматыку. Увесь зборнік — сацыяльнай скіраванасці — гэта адвечны плач, енк. У лепшым выпадку ён падымаецца на ўзровень роднай мовы. Акурат гэтыя творы і вывучаюць у школе.

Аднак у 1910-м годзе адбываецца рэзкаеператварэнне Купалы з паэта сацыяльнага ў нацыянальнага трыбуна. Пра гэта вельмі трапна сказаў Максім Гарэцкі ў сваёй «Гісторыі беларускае літаратуры» 1920 года. Ён сказаў, што Колас — гэта глыбокасацыяльны, народны пісьменнік ад зямлі, а Купала — нацыянальны паэт, які кліча на барыкады.

Калі ж адбыўся ў яго жыцці той самы пераломны момант?.. Нават адзін чалавек, які з'яўляецца на авансцэне гісторыі, можа змяніць ход падзей. У 1910 годзе ў Вільню з Рыгі вяртаецца малады чалавек, які робіцца сакратаром «Нашай Нівы». Гэта быў Вацлаў Ластоўскі — асоба, якой мы не аддалі належнага, нават на 10—20% ад таго, што яна заслугоўвае. Ластоўскі ўсё разумеў, некаторыя рэчы адчуваў інтуітыўна. І пачаў рабіць так, як ніхто іншы з нашаніўцаў.

Ластоўскі задумаўся, з чаго пачынаюць адраджэнне ў любой краіне? Калі нараджаецца пэўная нацыя, найперш выходзіць слоўнік, ствараюцца граматыкі, пішацца гісторыя, пачынае працаваць нацыянальны тэатр і г. д. Ён убачыў, што новая беларуская літаратура ўжо існуе каторы год (Багушэвіч, Дунін-Марцінкевіч). Але напісаных гісторыі, граматыкі няма! А што такое народ без гісторыі? Гэта народ без крылаў.

Вацлаў Ластоўскі ўзяўся пісаць гісторыю, хоць, як ён сам некалькі разоў пісаў, яна з'яўлялася кампіляцыйнай — асаблівых даследаванняў не рабіў, проста сабраў разам тое, што ўжо было вывучана. Але гэта гісторыя была напісана беларусам, па-беларуску і пра Беларусь. Гэта была першая такая праца. І Купалу падмянілі: ён прысвячае Ластоўскаму некалькі вершаў, напрыклад «Песню званара» (хаця пазней гэтыя прысвячэнні будуць знятыя). Купала дыяметральна змяняе напрамак сваёй паэзіі. Сацыяльная тэма цікавіць яго ўсё менш і менш. Варта чытаць Купалу з 1910 па 1926 год — гэта зусім іншы паэт. Тады пясняр напісаў «Прарока», з'явіўся этапны ў яго творчасці зборнік «Шляхам жыцця». У гэтых творах ужо іншая тэматыка. Гэта гістарычнае, слаўнае мінулае Беларусі. Любоў да сваёй зямлі, прыроды, жанчын. Ён піша геніяльныя паэмы — «Курган», «На куццю». У апошняй закладзена жыццёвае крэда пісьменніка, якое вызначыць і яго далейшую творчасць.

### Палітра беларускіх тыпажоў

Кожны паэт піша пра сваю нацыю і пра свой народ. І робіць гэта ўласным адметным голасам. Купала ў сваёй асаблівай стылістыцы сказаў пра беларусаў усё — і плюсы нашы, і мінусы раскрыў. Напрыклад, негатыўныя якасці яскрава вымалёўваюцца ў купалаўскім «Прароку». У гэтым творы прарок хадзіў па краінах і заклікаў усіх да святла, да праўды, да сонца, да светлай будучыні. Многія народы прыслухоўваліся, ішлі следам, дапамагалі яму, да нечага імкнуліся. Пабываў прарок «у край забраны», дзе людзі нават імя свайго не памятаюць, і пачаў рабіць тыя ж заклікі. А народ яму адказаў: «Па колькі нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?..»

У «Тутэйшых» таксама створана надзвычай яскравая палітра нашых тыпажоў. Многія рысы выразна відаць у Янку Здольніку. Усходні і Заходні вучоныя там дарэчы. І ўсе мы ў Купалы ёсць... У «Паўлінцы» асаблівасці мясцовага характару таксама прапісаны. «Раскіданае гняздо» ўвогуле не прачыталі: нам крытыкі калісьці ўклалі ў галаву, што гэта сацыяльная драма, дзе паніч згвалціў Зоську, дзе ідзе барацьба за зямлю... Праўда, ніхто не акцэнтуе ўвагу на апошніх радках, у якіх на пытанне «Куды яны ідуць?» даецца адказ «Па Бацькаўшчыну». Трэба ўспрымаць гэта як алегарычную паэму. І вобраз Зоські — не што іншае як вобраз Беларусі, а паніч не хто іншы як нашы суседзі.

Адным словам, Купалу мы не прачыталі. Ні паэмы яго, ні публіцыстыку. Трэба чытаць яго публіцыстыку нашаніўскай пары і 1918—1920 гадоў — часоў станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Ён усё прадбачыў і разумеў.

### Унутраная эміграцыя

Многія носяцца з купалаўскай спадчынай. Часам можна пачуць, маўляў, нельга яго чытаць, ён кан'юнктуршчык... Але каб усе, хто так кажа, самі трапілі ў тую сітуацыю, у самыя страшныя 1930-я гады... У той змрочны час Купала і Колас нікуды не з'ехалі, а засталіся тут, са сваімі сем'ямі.

Наконт купалаўскай творчасці сталінскіх часоў вядуцца спрэчкі, сам ён пісаў ці не? Я мяркую, што сам. Аднак калі паглядзець на якасць твораў і, самае галоўнае, на колькасць... З 1930 па 1942 год ён стварыў мізэр у параўнанні з тым, што напісаў да таго. У кагó Купала перакваліфікаваўся і чым пачаў займацца? Перакладамі. Ён, па сутнасці, пайшоў ва ўнутраную эміграцыю. Паэт перакладаў Пушкіна, Шаўчэнку. А свайго пісаў мала ці зусім нічога. А пра тое, як Купала і Колас самі думалі пра сваю тагачасную творчасць, можна прачытаць у рамане-эсэ Алега Лойкі пра Янку Купалу «Агонь як вада». Абодва класікі разумелі, што гэта дрэнныя творы, і адкрыта казалі пра тое адно аднаму».

* * *

Пасля такой сур'ёзнай размовы з Міхасём Казлоўскім ёсць над чым задумацца. Недаацэненая спадчына самага важнага класіка — гэта нібы скарб, які застаецца за зачыненымі дзвярыма. Адразу захацелася перачытаць Купалу... усяго — а найперш тое, што было створана з 1910 па 1926 год. Разгарнула паэму «На куццю», напісаную ў 1911 годзе:

«...Ня ўмруць,
ня ўмруць ужо яны,
Раз хочуць сонца,
славы, песьні;
Заб'юць ім зычныя званы
Прабудным
звонам напрадвесьні...
На дзеле —
кожны йшчэ слугой,
У думках —
вольныя ўжо людзі;
Над сэрцам іх, над іх душой
Наш дух лунаці
вечна будзе».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

*аг. Маркава*

■

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
Напачатку было Слова

# УСЛЕД ЗА ПЕРШАДРУКАРОМ

## У Гродне прайшоў конкурс на лепшую самаробную кнігу твораў Францыска Скарыны

**У рабоце над самавыданнем поўнасцю забаранялася выкарыстоўваць камп'ютарную тэхніку ці чужыя пераплёты. Усю кнігу — ад першай да апошняй старонкі — трэба было зрабіць уласнымі рукамі.**

Аказалася, што многія гродзенцы не супраць таго, каб паспрабаваць сябе ў ролі друкароў. Прычым яны павінны былі адмовіцца ад усіх сучасных дасягненняў, а карыстацца толькі тымі матэрыяламі, якія маглі быць 500 гадоў таму. Напрыклад: скура, тканіна, папера, саломка. Пры гэтым удзельнікі конкурсу былі пастаўлены ў больш складаныя ўмовы, бо ім забаранялася нават друкаваць.



Усяго на конкурс з усіх куткоў вобласці паступіла больш за 100 выданняў, якія зроблены як творчымі калектывамі, так і асобнымі майстрамі. Разам з уласнымі кнігамі гродзенцы даслалі нават скульптурную выяву самога Скарыны. Дарэчы, гэта работа ўвайшла ў шэраг пераможцаў конкурсу.

Па словах **дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага Лідзіі МАЛЬЦАВАЙ,** конкурс на лепшую самаробную кнігу праходзіць другі раз і прымеркаваны да Дня беларускага пісьменства. Да яго далучыліся не толькі бібліятэкі, але і цэнтры рамёстваў, школы і гімназіі, асобныя кнігалюбы. Калі першы раз было толькі паўсотні ўдзельнікаў, то цяпер іх стала ў два разы больш. **Дырэктар прадпрыемства «Гроднааблсаюздрук» Павел СКРАБКО** упэўнены, што конкурс захаваецца і надалей. Гэта ўнікальныя выданні, якія зроблены не толькі з майстэрствам, але і з душой.

Самаробныя кнігі ацэньваліся па аб'ёме працы — за які тэрмін яны зроблены. Так, цісненне скуры для пераплёту патрабуе больш часу, чым, напрыклад, пераплёт з тканіны. Таму і бал выстаўляўся вышэйшы.

Майстры карысталіся рознымі тэхнікамі. Былі тут кнігі з бяросты, інкрустацыя саломкай, вышыўка, арыгамі... Разам з тым усе выданні сваім зместам мелі афармленне твораў першадрукара Францыска Скарыны альбо іншых беларускіх асветнікаў. Лідзія Мальцава запэўніла, што ўсе самаробныя выданні будуць алічаваны і ўвойдуць у электронную базу бібліятэкі, а самі экспанаты зоймуць месца ў фондзе рэдкай кнігі.

Вынікі конкурсу падведзены падчас першага абласнога фестывалю кнігі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**У тэму:**

**Да 500-годдзя беларускага друку ў Новым замку Гродна** дэманструецца багатая калекцыя рэдкіх і стaрадрукаваных кніг і перыядычных выданняў. Самымі каштоўнымі экспанатамі лічацца кнігі-першадрукі, ці інкунабулы, якія выдадзены да 1500 года. На выстаўцы можна ўбачыць «Трактат па логіцы» прафесара Кракаўскага ўніверсітэта Яна Глагоўскага, лекцыі якога па філасофіі падчас навучання слухаў і Францыск Скарына.

Дэманструецца ў Новым замку прыжыццёвае выданне «Тэзісаў» Марціна Лютэра, які быў сучаснікам беларускага друкара, і ёсць падставы лічыць, што знакамітыя асобы былі знаёмы паміж сабой.

Шырока прадстаўлены старажытныя італьянскія выдаўцы эпохі ранняга Рэнесансу. У першую чаргу родапачынальнік вядомай дынастыі Альдам Мануцый, які праславіўся тым, што першы пачаў друкаваць кнігі невялікага фармату і ўвёў нумарацыю старонак. Менавіта новы фармат паспрыяў таму, што кніга «Італьянскія вершы» Франчэска Петраркі, выдадзеная ў 1501 годзе тыражом 100 тысяч экзэмпляраў, была хутка раскуплена. Таксама на выстаўцы ў Гродне можна ўбачыць поўны збор твораў знакамітага Петраркі выдання 1581 года. Італьянскі след ёсць і ў біяграфіі Францыска Скарыны. У Падуанскім універсітэце ён здаў экзамен на атрыманне навуковай ступені па медыцыне.

У больш позні перыяд выходзіць з друку «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні, дзе еўрапейскія чытачы знаёмяцца з гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага і партрэтамі вялікіх князёў. У экспазіцыі нямала каралеўскіх кніг. У свой час яны знаходзіліся ў бібліятэках французскага караля Людовіка XV, апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, расійскай імператрыцы Кацярыны II.

Усяго ў фондах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея захоўваецца звыш 20 тысяч рэдкіх старадрукаваных кніг і 12 тысяч рэдкіх перыядычных выданняў. Фонд музея саступае толькі Нацыянальнай бібліятэцы і бібліятэцы НАН Беларусі.

Пантэон Айчыны

# КЕЙСТУТ

(1297—1382)



Ён нібыта сышоў са старонак гісторыка-прыгодніцкага рамана — высакародны князь-воін, абаронца роднай зямлі. Нават ворагі-крыжакі прызнавалі ягоную высакароднасць і мужнасць. «Кейстут болей за ўсё любіў вайну і праўду. Калі ён жадаў напасці на прускую зямлю, заўсёды папярэдне паведамляў пра гэта маршалам Ордэна, а калі паведамляў, заўсёды з'яўляўся», — адзначаў ордэнскі храніст. Успамінаецца рускі князь-воін Святаслаў Ігаравіч, які папярэджваў сваіх ворагаў: «Іду на вы». Кейстут, як і яго старэйшы брат Альгерд, быў сынам Гедзіміна ад яго другой жонкі Вольгі, полацкай князёўны. Гэта і абумовіла іх братэрскае сяброўства і пэўнае супрацьстаянне астатнім братам — дзецям ад першай і трэцяй Гедзімінавых жонак. Паводле летапісцаў Кейстут і Альгерд пераўзыходзілі зводных братоў розумам і актыўнасцю. Хоць, у адрозненне ад разважлівага і хітрага Альгерда, Кейстут вызначаўся рашучасцю і прастадушнасцю. Гэта ён у 1345 годзе, не чакаючы Альгерда, захапіў Вільню, а пасля ўрачыста сустрэў брата, добраахвотна аддаўшы яму вялікакняжацкі пасад.

Са згоды Альгерда Кейстут правіў «воляю сваёй» у Троцкім княстве, куды ўваходзілі Гарадзенская, Берасцейская землі і Падляшша. І калі Альгерд пераважна займаўся «рускімі» справамі, дык Кейстут ваяваў з Ордэнам. Аднак у найважнейшых агульнадзяржаўных справах удзельнічаў і Кейстут. Ён удзельнічаў у паходах Альгерда на Маскву, ваяваў разам з Любартам супраць польскага караля Казіміра Вялікага за Валынь, адстаяўшы ад яго дамаганняў Луцк. Але часцяком Кейстут дзейнічаў самастойна, і, бывала, толькі знаходлівасць і авантурная дзёрзкасць дапамагалі яму выйсці пераможцам са складанага становішча. Калі ў 1350 годзе 90-тысячнае ўгорскае войска рушыла на Берасцейшчыну, Кейстут пераправіўся цераз Буг і заявіўся ў варожы стан каля Мельніка. Здзіўленаму каралю Людовіку Кейстут прапанаваў мір і абяцаў хрысціцца ў каталіцтва. Кейстут пакляўся па адмысловым язычніцкім рытуале, і ўражаны Людовік паверыў «паганцу». А той і не думаў трымаць сваю клятву, якую лічыў несапраўднай. Праўдападобна, што Кейстут, як і яго бацька, быў арыянінам і сваім паганскім рытуалам проста абдурыў угорскага караля. Пазней угорскі храніст Ян з Кікулёва прызнаўся, што паход быў не супраць паганцаў, а «супраць літоўскіх хрысціян і самай вялікай дзяржавы Русі», чым, у адрозненне ад тэндэнцыйных ордэнскіх храністаў і рускіх летапісцаў, засведчыў аб існаванні асобнай хрысціянскай канфесіі літвінаў.

Скарыстаўшыся даверлівасцю ўгорскага караля, Кейстут па дарозе ў Венгрыю ўцёк, а ўгорскае войска разышлося. Неверагодна, але вось такім хітрым чынам Кейстут выратаваў свой край ад варожага нашэсця. Двойчы ён трапляў у палон да крыжакоў і двойчы ўцякаў.

Калі ў 1361 годзе яго злавілі на паляванні крыжакі і ўвязнілі ў Мальбаркскім замку, Кейстут праявіў зайздросную вытрымку і знаходлівасць. Ён схіліў на свой бок ахоўніка, і той прынёс у ягоную камеру кірку. Па начах князь прабіваў у сцяне дзірку, а раніцай завешваў яе шпалерай. Ахоўнік падчас малітваў ордэнскіх братоў у касцёле выносіў з каморы друз. Калі пралом быў зроблены, Кейстут па вяроўцы спусціўся ў замкавы двор, дзе чакаў ягоны спадручнік. Яны пераапрануліся ў крыжацкую вопратку і на конях, узятых у стайні, выехалі з замка. Вартавыя нічога не западозрылі, калі аклікнулі іх. Кейстут добра валодаў нямецкай мовай і выдатна сыграў ролю крыжака. Высланая пагоня так і не знайшла ўцекачоў.

А Кейстут ужо з Трок напісаў магістру ліст і падзякаваў яму за добры прыём і запрасіў да сябе, паабяцаўшы найлепшы пакой. Не словы гневу, праклёну і пагроз, а дабрадушны жарт з няўцямнага магістра, які не ўсцярог свайго «госця».

Не здзіўляе аднадушнасць ордэнскага храніста і польскага хроніка Яна Длугаша, якія прызнаюць найлепшыя якасці Кейстута. «Калі ён заключыў мір з магістрам, дык трымаў яго моцна. Калі ён лічыў каго-небудзь з братоў нашых чалавекам храбрым і мужным, дык праяўляў да яго шмат любові і гонару». «Кейстут, хоць паганец, быў доблесным мужам: сярод Гедзімінавых сыноў ён вызначаўся разважнасцю і знаходлівасцю, і, што больш за ўсё робіць яму гонару, ён быў адукаваны, чалавекалюбы і праўдзівы ў словах», — пісаў непрыхільнік да Літвы Ян Длугаш. А пахвала ворага — гэта прызнанне відавочнага, што нельга ачарніць ці проста замаўчаць. Ведаючы праўдзівасць Кейстута, гарнізоны крыжацкіх замкаў здаваліся яму на абяцанне захаваць жыццё. Ці многа мы знойдзем у тагачаснай гісторыі падобных постацяў? Пытанне, на якое цяжка адказаць, а можа, чэсна прызнаць, што няма такіх. Але ў жорсткім свеце войнаў, інтрыг, крывадушша і падману высакародныя героі гінуць. Так здарылася і з Кейстутам.

Пасля смерці Альгерда ў 1377 годзе Кейстут дапамог ягонаму сыну Ягайлу зацвердзіцца на вялікакняжацкім пасадзе. Мудрай парадай Кейстут дапамагаў маладому гаспадару правіць дзяржавай. Але падбухтораны сваёй маці, княгіняй Уляннай і крыжакамі, Ягайла западозрыў Кейстута ў жаданні захапіць вялікакняжацкі пасад. Ён заключыў патаемны саюз з Ордэнам, паводле якога крыжакі маглі нападаць на Троцкае княства, а Ягайла абавязваўся не дапамагаць Кейстуту і больш за тое паведамляць ім аб яго планах. Кейстут ніяк не мог здагадацца, чаму ўладанні Ягайлы не спусташаюцца крыжакамі, а ягоныя церпяць ад іх нападаў, чаму яны загадзя ведаюць аб ягоных паходах і чакаюць яго, пакуль не даведаўся ад аднаго з камандораў аб здрадзе Ягайлы. Тады Кейстут у 1381 годзе нечаканым нападам захапіў Вільню і ў вялікакняжацкай канцыляры знайшоў патаемную дамову Ягайлы з Ордэнам. Тайнае зрабілася відавочным. Ва ўсе часы здраднікаў каралі вельмі жорстка. Кейстут жа не смерцю, дык няволяй. Кейстут пашкадаваў братаніча. Чалавечае перамагло ў ім дзяржаўнае. Ягайла пад невялікай вартай быў адпушчаны ў свае родавыя Крэва і Віцебск. І гэта было фатальнай памылкай Кейстута.

Заняты арганізацыяй адпору крыжакам, а пасля падрыхтоўкай паходу на ягайлавага брата ноўгарад-северскага князя Дзмітрыя-Карыбута, Кейстут прагледзеў змову братаніча з віленцамі і крыжакамі. Праз пасярэдніцтва братоў Свідрыгайлы і Скіргайлы Ягайла заключыў з Ордэнам дамову, саступаючы яму Жамойць і абяцаючы прыняць каталіцтва. Што не зробіш за ўладу, і маці родную прадасі, а не тое, што радзіму.

Падчас паходу Кейстута ў 1382 годзе на Ноўгарад-Северскі Ягайла з Крэва нечакана з'явіўся ў Вільні, дзе яго памагатыя здалі яму віленскія замкі. А пасля Ягайла з крыжакамі пайшоў на Трокі. Кейстут, даведаўшыся пра чарговую здраду братаніча, вярнуўся з паходу і загарадзіў шлях на Трокі. Тады Ягайла прапанаваў Кейстуту і ягонаму сыну Вітаўту прыехаць да яго ў стан для перамоў. Кейстут ужо не верыў братанічу, але Вітаўт угаварыў бацьку ехаць на перамовы. Высакародныя людзі вераць, што нават у апошняга нягодніка застаецца хоць трохі годнасці, а таму часта і становяцца ахвярамі сваёй наіўнай даверлівасці. Кейстут паверыў Ягайлу, бо хацеў пазбегнуць братазабойчай вайны, а ў выніку апынуўся ў лёхах Крэўскага замка. На пятыя суткі ў камеру ўварваліся ахоўнікі і нейкі крыжак і задушылі князя. Так загінуў герой вайны з Ордэнам, паплечнік Альгерда, вялікі князь, які змог бы прадухіліць крывавую міжусобіцу паміж Вітаўтам і Ягайлам, пазбегнуць згубнай для ВКЛ Крэўскай уніі, вывесці краіну з тупіковага шляху, куды завёў яе Ягайла. Наступствы смерці Кейстута адгукнуліся Люблінскай уніяй, стратай ВКЛ свайго рэальнага суверэнітэту, польскай палітычнай і культурнай экспансіяй.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Сваімі словамі



# ЛЫНТУПЫ, У ЯКІЯ Я ВЕРУ

## Чаму варта ехаць на край Беларусі?

**Мы маем яшчэ адзін маленькі беларускі цуд. Ці, можа, пачатак праекта, які стане чымсьці сапраўды значным? Так ці іначай, цікавая ініцыятыва з'явілася... калі не на краі свету, то на краі Беларусі — у Лынтупах. Менавіта там, на мяжы з Літвой, запрацаваў «Лынтупскі культурны цэнтр «Культыватар». Што ж гэта такое і чым цікавае для нас, жыхароў іншых рэгіёнаў? Паспрабуем разабрацца.**




1. Гэта той выпадак, калі **ініцыятыва** зноў **распачата прыватнымі асобамі.** Архітэктар-рэстаўратар Вадзім Глінік упершыню трапіў у Лынтупы яшчэ ў юнацтве, падчас летніх вандровак. І гэты край яго настолькі прывабіў, што, нават будучы жыхаром сталіцы, сувязі з ім ён не пакідаў. Глінік з'яўляецца навуковым кіраўніком рэстаўрацыі многіх мясцовых аб'ектаў — касцёла ў Камаях, аптэкі ў Паставах, парку ў Варапаеве, помніка 1812 года ў Асінагарадку, да таго ж архітэктурнага ансамбля палаца Бішэўскага ў Лынтупах.

Вадзім Глінік набыў у гэтым краі лецішча, у вёсцы Вайшкуны. Побач апынулася шмат цікавых суседзяў, якія таксама прыехалі са сталіцы ці іншых гарадоў. Разам пачалі марыць пра стварэнне культурнага цэнтра. Таму неўзабаве Вадзім Глінік разам з жонкай Ядвігай Лукашык і іншымі «мясцовымі» аднадумцамі набраліся смеласці і зарэгістравалі Лынтупскі культурны цэнтр «Культыватар».

2. Адна з мэт праекта — **рэстаўрацыя старадаўняга цаглянага будынка,** у якім ён зарэгістраваны. Прыблізна тым самым часам, як вырашана было стварыць новы культурны асяродак, на продаж выставілі старадаўнюю камяніцу. Першапачатковa сябры «Культыватара» (большасць з якіх з'яўляюцца прафесійнымі архітэктарамі-рэстаўратарамі) набылі яе, каб захаваць муры, аўтэнтычныя дзверы і вокны. Пазней вырашылі, што культурны цэнтр варта размясціць менавіта ў ёй.

Цяпер распрацоўваецца праект, які прадугледжвае захаванне архітэктурных асаблівасцяў гістарычнага будынка, і робіцца неабходныя падрыхтоўчыя работы.

3. **У рэгіёне,** па задуме арганізатараў, **завіруе актыўнае культурнае жыццё.** Тут мараць, што дасведчаныя, вядомыя ў Беларусі людзі будуць прыязджаць у Лынтупы, каб падзяліцца сваёй творчасцю, цікавымі ідэямі.

У красавіку гэтага года праект арт-дырэктара «Культыватара» Ядвігі Лукашык падтрымала кампанія «Актывія». Быў выдзелены грант на 5,5 тыс. руб., які дазволіў у Мінску і Лынтупах зладзіць выстаўку «Беларусь часоў Першай сусветнай вайны ў фотаздымках Фрыца Краўскопфа», адрамантаваць частку памяшканняў «Культыватара» і набыць спецыяльнае асвятленне для музейнай часткі культурнага цэнтра. «Не, я не зрабіла нічога асаблівага, — адзначае Ядвіга. — Проста я веру ў нашу справу. Але проста верыць мала, трэба рабіць...»

У планах — стварэнне канцэртна-выставачнай залы, памяшкання для клубных занятаў (літаратурнага, музычнага і іншых), кавярні, дзіцячага кафэ, невялікай музейнай экспазіцыі і выстаўкі гістарычных фотаздымкаў Лынтупшчыны часоў Першай сусветнай вайны.

4. Натуральна, калі ствараецца такая ініцыятыва, ёй **неабходна падтрымка грамады.** І гэта не толькі валанцёрская праца па аднаўленні і добраўпарадкаванні будынка (а там вітаюць ахвотных). Нядаўна была распачата краўдфандынгавая кампанія. На працягу яшчэ васьмі дзён кожны ахвотны на сайце talaka.org можна знайсці праект «Рэстаўрацыя будынка Лынтупскага культурнага цэнтра. Крок 1: вокны і дзверы» і пералічыць туды невялікую суму грошай (дарэчы, узамен будуць уручаны цікавыя падарункі — гліняныя піялкі, падсвечнікі ці адмысловыя мяшочкі, пашытыя з тканіны).

Арганізатары заўважаюць, што для іх каштоўны любы ўнёсак, бо ён азначае асабісты ўдзел, далучанасць да сацыяльна значнай справы і тое, што людзі паверылі ў іх праект.

5. «Лынтупшчына — **прыцягальная для турызму,** у яе ёсць для гэтага рэсурсы, — адзначае **ландшафтны дызайнер, кансультант «Культыватара» Яна МАРЧУК.** — Найперш, прыродныя — хараство беларускага Паазер'я. Краявіды вакол Лынтупаў — гэта стромкія ўзвышшы і доўгія грады, пакрытыя хваёва-яловым лесам, і безліч азёр: чысцюткіх, глыбокіх і плыткіх, вялікіх і маленькіх... Калісьці ў гэтых мясцінах было шмат шляхецкіх сядзіб. У радыусе пяцідзесяці кіламетраў ад Лынтупаў можна знайсці два тузіны былых панскіх маёнткаў. Ад большасці з іх не засталося амаль нічога, некаторыя захавалі асобныя будынкі і рэшткі паркаў. Такія цікава наведаць і цяпер: Камарова, Каралінава, Манькавічы, Шайкуны, Раманішкі ды іншыя сядзібы».

* * *

Што патрэбна для таго, каб паехаць на самы край Беларусі, каб застацца назаўжды?.. Ведаць, што там жывуць іншыя неабыякавыя людзі. І што разам у вас можа атрымацца штосьці вельмі добрае. Ва ўсякім разе, вы паспрабуеце.

У будучыню «Культыватара» я чамусьці цвёрда веру. Можа, таму што разам сабралася добрая каманда, якая за паўгода ўжо зрабіла тое, пра што іншыя проста мараць цэлымі дзесяцігоддзямі?.. Да таго ж непадалёк знаходзіцца арт-вёска Каптаруны, дзе не так даўно праходзіў літаратурны фэст, з'езд кіношнікаў, а таксама эка- і арт-пленэры.



Можа быць, гэтай той пачатак, які мы так доўга чакалі? Мінск перастане быць манапалістам на вірлівае творчае жыццё. Заўважныя культурныя зрухі пачнуць адбывацца і ў рэгіёнах, і нават на краі Беларусі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Сушильная камера для древесины рядного размещения с инв. №96001624 | «Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть» | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 51 240,00 | 5 124,00 | 2 562,00 |
| Лот №2 | Сушильная камера линия Sekal (бойлерная) с инв. №96001673 | «Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть» | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 35 760,00 | 3 576,00 | 1 788,00 |
| Лот №3 | 1. Транспортер цепной с инв. №71000121.<br>2. Линия раскроя лесоматериалов BRODPOL с инв. №96001500.<br>3. Вентилятор в сборе в системе аспирации BRODPOL с инв. №96001640.<br>4. Система аспирации с инв. №96001487 | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 162 840,00 | 16 284,00 | 8 142,00 |
| Лот №4 | Капитальное строение с инв. №630/С-75230, площадь – 4 480,0 кв. м, наименование – склад хранения пиломатериалов, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 67 080,00 | 6 708,00 | 3 354,00 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 50,9994 га с кадастровым номером 623886007601000757 является неделимым. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Земельный участок находится в охранной зоне: линий электропередачи, код – 5,2, площадь – 2,9281га; газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 4,8900 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №5 | Капитальное строение «Автостоянка» с инв. №630/С-75657, площадь – 5 500,0 кв. м, назначение – сооружение специализированное транспорта | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть. | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 68 640,00 | 6 864,00 | 3 432,00 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 50.9994 га с кадастровым номером 623886007601000757 является неделимым. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Земельный участок находится в охранной зоне: линий электропередачи, код – 5,2, площадь – 2,9281га; газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 4,8900 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №6 | Капитальное строение с инв. №630/С-74523, наименование – жилой дом, площадь – 164,3 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома | Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Ракутевщина, ул. Молодежная, 8А | **Начальная цена без НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| | | | 105 000,00 | 10 500,00 | 5 250,00 |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,2119 га с кадастровым номером 623881711601000052. Целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. Право аренды – по 06.11.2017. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.
Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 27.10.2017 в 11.30 (регистрация участников с 11.00 до 11.20) по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская 1, кабинет директора**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi
До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X ,УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом 27 октября 2017 г.
Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122. Окончание приема заявлений – 25.10.2017 в 15.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Мацюк Андрей Богданович, тел. 8 (029) 698 51 76.
Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов. Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: • 8 (029) 339-68-45 • e-mail: frondera@mail.ru**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Вольт», г. Могилев, Гомельское шоссе, 38 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Участок изготовления металлоконструкций** | Здание нежилое | 1222,7 кв. м | 700/С-6119 | Могилевская обл., г. Могилев, ш. Гомельское, 38/4 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Одноэтажное каменное здание участка изготовления металлоконструкций |
| **Обременения** | Частичная аренда.<br>Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |

**Сведения о земельном участке**

Предмет аукциона расположен на земельном участке общ. пл. 4,5026, предоставленному продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административно-бытовых и производственных помещений. Продавец в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания предмета аукциона между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть заключен договор купли-продажи

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20%** | **143 280,00 белорусских рублей (снижена на 40%)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 31.08.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.10.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.10.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by |

---

Минский городской центр недвижимости

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 27 октября 2017 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 218-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – ОАО «Гостиница Планета»**, тел.:+375 (17) 226-73-58, +375 (17) 226-77-85, +375 (17) 226-80-41 | | | | | | | |
| 1 | г. Минск, пр-т Победителей, 31-1 | 265,7 | 398,55 БАВ | 1 009,66 | Под объект общественного питания | 100,90 | Встроенные изолированные помещения (зал –166,5 кв. м, кухня – 25,4 кв. м, моечная – 4,5 кв. м, кладовая – 4,7 кв. м, коридоры – 19,4 кв. м, служебная – 9,7 кв. м, санузел – 11,5 кв. м, кабинет – 24 кв. м) на 1-м этаже. **Срок аренды – 3 года** (1*) |
| | 1* Имеются: отопление, санузел, естественное освещение, энергоснабжение, отдельный вход. Необходимые условия: согласовать с администрацией Центрального района г. Минска форму объекта и режим его работы, получить все необходимые разрешения для данного вида деятельности, обеспечить функционирование объекта исключительно по целевому назначению с соблюдением норм и правил пожарной охраны и техники безопасности, обеспечить страхование арендатором в пользу арендодателя арендуемого имущества на случай его повреждения (гибели) | | | | | | |
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский,** тел.:+375 (17) 225-61-21, +375 (17) 225-69-77 | | | | | | | |
| 2 | г. Минск, пл. Привокзальная, 7 | 20,5 | 3,0 | 77,90 | Под размещение аптеки с круглосуточным режимом работы, организацию розничной торговли непродовольственной группы товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения) | 7,70 | Помещение №25 расположено в здании конкорс, находящемся над железнодорожными путями. Имеются: центральное отопление (в период отопительного сезона), санузел, естественное освещение, пожарная сигнализация и видеонаблюдение (включенные в общую систему вокзального комплекса), общий вход. Необходимость ремонта отсутствует, в ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. **Срок аренды – 3 года** |

БАВ – базовая арендная величина с 01.04.2017 составляет 15,20 рубля.

